ЗЬЯЗДА

Орган Цэнтральнага і Менскага Камітэтаў КП(б)Б

ЛІПЕНЬ 29 1932 г. № 168 (4420). Год выдаўня XV

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ, ПЕРАМАГЫ — Да карэнную перабудову работы сельспажыўтаварыстваў.

АБ МІЖНАРОДНЫМ АНТЫВАЕННЫМ ДНІ 1 ЖНІЎНЯ—Пастанова ЦК КП(б)Б (1 стар.).

ЧАРГОВЫЯ ЗАДАЧЫ АРГАНІЗАЦЫЙНА-ПАРТЫЙНАЙ, МАСАВАЙ І ПАЛІТ-ВЫХАВАЧАЙ РАБОТЫ ПАРТЫІ — Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Б. Ю. ЖАБРОЎСКАГА на ліпеньскім пленуме ЦК КП(б)Б (2, 3 і 4 стар.).

Кожны дзень зацягваньня сенаўборкі — гэта страты тысяч цэнтнэраў каштоўнейшых кармоў. Раўняцца па Менскім раёне, які вышаў на першае месца па ўборцы сенажацяй (1 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Працэс белабандыта Гаргулава (4 стар.). Наперакор ваенна-палявым судом і шыбеніцам (4 стар.).

За карэнную перабудову работы сельспажыўтаварыстваў!

Сельспажыўтаварыства павінна стаць сапраўдным арганізатарам савецкага гандлю ў вёсцы—такава ўстаноўка партыі.

Зусім выразныя і неаднаразовыя пастановы партыйных і савецкіх арганізацый аб рабоце сельскай спажывецкай каапэрацыі з выключнай паўнатой намячалі праграму баявой дзейнасьці гэтага важнейшага нізавога зьвяна спажывецкай каапэрацыі.

У пастановах ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б асабліва падкрэсьлівалася неабходнасьць умацаваньня нізавой гандлёвай сеткі, устаноўленьня гаспадарчай самастойнасьці спажывецкай каапэрацыі.

Трэба проста сказаць, што гэтыя пастановы партыі не знайшлі яшчэ поўнага праламленьня ў рабоце нізавой каапэрацыі.

«Нізавая спажывецкая сетка (сельспажыўтаварыства, вясковая крама і г. д.), як правіла, гандлем не займаецца, тавараў ня шукае і зьяўляецца, па сутнасьці, пунктам мэханічнага разьмеркаваньня цэнтралізаваных фондаў». Асноўнай і рашаючай прычынай нездавальняючай работы нізавой каапэрацыі зьяўляецца слабасьць яе перабудовы, адсутнасьць неабходнай гібкасьці і апэрацыйнасьці ў рабоце апарату. Слабасьць перабудовы работы, паяўнасьць элемэнтаў мэханічнага разьмеркаваньня, амаль поўная адсутнасьць самастойных закупак і самазагатовак, а таксама выбару асартымэнту тавараў ў розных каапэрацыйных і прамысловых аб'яднаньняў — усё гэта ня можа не адбіцца на разгортваньні савецкага гандлю ў вёсцы, па ўзмацненьні таваразвароту паміж горадам і вёскай.

Частка работнікаў спажывецкай каапэрацыі апартуністычна недаацэньваюць таго, што ўзмацненьне тавараснабжэньня вёскі на даным этапе зьяўляецца цэнтральнай задачай. Не разумеюць таго, што барацьба за павялічэньне патоку с.-г. прадуктаў у горад неадлучна ад барацьбы за лепшае снабжэньне прамтаварамі вёскі. З такога роду апартуністычнай недаацэнкай трэба павесьці самую рашучую, бязьлітасную барацьбу. Нельга ні ў якай меры цярпець такога становішча, калі значная частка сельскіх спажывецкіх таварыстваў ня толькі не пераключылася на разгортваньне калгаснага гандлю, але працягвае будаваць сваю работу па прынцыпе «што дадуць, тое і добра», «спажывец ўсё зьесьць». Такога парадку самацёчнага настроі ёсьць горшы від праяўленьня апартунізму на сучасным этапе. Яны выцякаюць з няправільнага разуменьня задач сельспажыўтаварыстваў, як арганізатараў савецкага калгаснага гандлю. Гэтыя настроі цалкам выцякаюць з няправільнай тэндэнцыі мэханічнага разьмеркаваньня тавараў, яны звужваюць таваразварот.

З другога боку, трэба рашуча вытруціць буржуазна-рвацкі пэпманскі дупок, які накіроўвае на тое, каб «зарабіць» на савецкім гандлі.

На апошнім пленуме ЦК і ЦКК тав. Рыкін у сваім дакладзе прыводзіў рад шматлікіх фактаў з работы сельспажыўтаварыстваў. Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што частка работнікаў каапэрацыі страціла клясавую бальшавіцкую пільнасьць, забыла аб важнейшай і неабходнай умове ўмацаваньня таваразвароту, не зразумела таго, што забываньне гэтых умоў адмоўна ўплывае на змычку гораду з вёскай.

Апошні пленум ЦК і ЦКК даў зусім выразныя, вычарпальныя дырэктывы, накіраваныя на тое, каб ператварыць сельспажыўтаварыства ў асноўнае зьвяно савецкага гандлю па вёсцы. Гэта абавязвае ўсе партыйныя, савецкія, камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі неадкладна ўзяцца за ажыцьцяўленьне баявых пастаноў пленуму. Іменна перабудова работы нізавой каапэрацыі павінна ісьці ў напрамку рэалізацыі гэтых пастаноў. Асноўнымі каналамі перабудовы работы сельспажыўтаварыстваў павінна быць разгортваньне сапраўднага савецкага гандлю, рашучая барацьба з усякага роду спэкуляцыйнымі тэндэнцыямі і тэндэнцыямі мэханічнага разьмеркаваньня тавараў.

Нізавая сетка спажывецкай каапэрацыі павінна будаваць сваю работу на прынцыпе цьвёрдага правядзеньня **гаспадарчага разрахунку**, узмацненьня тавараснабжэньня вёскі, лепшага і больш поўнага абслугоўваньня спажыўца, уцягненьня ў сваю дзейнасьць вялізарных мас працоўных.

Разгортваньне савецкага гандлю ставіць ва ўсю шырыню задачу ўсямернага выкуваньня попыту вёскі і задаваленьня попыту працоўнага спажыўца. Нельга змагацца з мэханічным разьмеркаваньнем тавараў, з бюракратызацыяй таваразвароту, з затаварваньнем і інш., не змагаючыся за шырокі асартымэнт тавараў, за задаваленьне надзённых запатрабаваньняў спажыўца — калгасьніка і працоўнага адпасобніка.

Глыбокае вывучэньне попыту кожнай вёскі, калгасу, саўгасу, МТС і нават паасобнай калгаснай брыгады, чулае і ўважлівае выслухоўваньне запатрабаваньняў спажыўца,—вось асноўнае, на чым павінна будаваць свае закупкі каапэрацыя. Міжраённыя базы ў сваю чаргу павінны перабудаваць сваю работу пад кутом гледжаньня задаваленьня спэцыфічных запатрабаваньняў вёскі, калгасу, саўгасу і г. д. Сельспажыўтаварыствы павінны павесьці самую рашучую барацьбу з прымусовым навязваньнем асартымэнтаў. Самастойнасьць апэрацый, выбару асартымэнтаў тавараў, заключэньне дагавораў і г. д.—вось шляхі, па якіх павінна ісьці сыстэма закупкі тавараў.

Дакладнік, які абвешчан ЦКК РСІ, ЦК ЛКСМБ, «Зьвяздой» і «Рабочай» па прасоўваньні тавараў у вёску — павінен прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх партыйных арганізацый.

Разгортваньне вырабу тавараў шырокага спажываньня ставіць перад сельспажыўтаварыствамі ва ўсю шырыню задачу арганізаваць сустрэчу гэтых тавараў, скараціць іх шлях да спажыўца, зжыць усякага роду замарожваньне тавараў і г. д. Між тым, ужо зараз выяўлен рад фактаў, калі магутны прыток тавараў засьпігае нізавых работнікаў каапэрацыі зьнянацку.

Замест апэрацыйнасьці і гібкасьці ў прасоўваньні тавараў, яны замарожваюцца, а ў некаторых мясцох разбазарваюцца і не даходзяць да спажыўца. Узмацненьне тавараправодзячай сеткі, арганізацыя грамадзкага кантролю—вось, што павінна пранізаць работу як міжраённых баз, так і апарату сельспажыўтаварыстваў.

Трэба дабіцца такога становішча, каб за прасоўваньнем кожнага тавару ў вёску быў наладжан глыбокі і ўсебаковы грамадзкі кантроль. Наіўна і недарэчна гучаць словы паасобных гора-каапэратараў: «мы абыйдземся без грамадзкага кантролю».

Такія разважаньні нічога супольнага з лініяй партыі ня маюць. Без наладжаньня грамадзкага кантролю, без уцягненьня ў работу шырокіх мас пайшчыкаў немагчыма перабудова каапэрацыі, немагчыма зьнішчэньне тых агіднейшых фактаў, якія маюць месца ў рабоце раду сельспажыўтаварыстваў. Гэтага яшчэ не ўясьніла значная частка каапэрацыйных, прафсаюзных і некаторых раённых партыйных работнікаў. Толькі гэтым можна вытлумачыць амаль поўную адсутнасьць работы крамкамісій, калупчэўнаважаных, слабасьць масавай работы з пайшчыкамі і г. д. За апошні час выяўлены грубейшыя факты парушэньня пралетарскай дэмакратыі, калі паасобныя старшыні сельспажыўтаварыстваў мэханічна назначаюцца, а не выбіраюцца сходам пайшчыкаў. Усё гэта ставіць задачу рашучага зьнішчэньня гэтых зьявішчаў. Агнём бальшавіцкай самакрытыкі трэба выпальваць «лявацкае» адміністраваньне, парушэньне пралетарскай дэмакратыі, ігнараваньне мас і г. д. **Той не каапэратар-бальшавік, хто не апіраецца на масы, хто не працуе з імі, хто не стаіць на чале іх.**

Надзвычай важным у перабудове работы нізавой каапэрацыі зьяўляецца праблема кадраў. Ліпеньскі пленум ЦК намеціў канкрэтныя і баявыя шляхі па паляпшэньні і ўмацаваньні складу каапэрацыйных работнікаў. Накіраваньне адказных партыйных работнікаў для работы ў каапэрацыі — ёсьць адно з важнейшых практычных мерапрыемстваў па ўзмацненьні работы.

Значная частка раённых партыйных арганізацый не пераключылася на практычную дапамогу ў падрыхтоўцы кадраў для каапэрацыі. Белкаапсаюз далей складаньня плянаў падрыхтоўкі кадраў не пашоў. Месяцамі цягнецца перапіска са Слуцкім, Чырвонаслабодзкім, Крупскім і іншымі раёнамі аб арганізацыі курсаў, але далей перапіскі справа ня ідзе. Белкаапсаюз павінен паводле пляну падрыхтаваць звыш 7.000 чалавек каапэрацыйных работнікаў, пакуль што праз усе формы падрыхтоўкі прайшла нязначная колькасьць. Засядацельская мітусьня, агульныя разважаньні аб падрыхтоўцы кадраў зрываюць правядзеньне гэтай важнейшай справы. У нас няма ніякай гарантыі ў тым, што пры такой сыстэме работы плян ня будзе выкананы. Пара спыніць гульню ў перапіску. Органы РСІ павінны праверыць па ўсіх зьвязьніх стан падрыхтоўкі кадраў па сыстэме Белкаапсаюзу. Трэба прыняць самыя рашучыя меры да аздараўленьня работы сельспажыўтаварыстваў. Праблема кадраў — важнейшае зьвяно ў рабоце каапэрацыйных арганізацый. Ей павінна быць аддана выключна важнае значэньне.

ЦКК і райсаюзы павінны пераключыцца на баявое апэрацыйнае, канкрэтнае кіраўніцтва сельспажыўтаварыствамі.

Апошнія пастановы ЦВК і СНК СССР і ЦК УсеКП(б) аб рабоце прамысловай каапэрацыі ў значнай ступені датычыць і работы сельскіх спажывецкіх таварыстваў. Трэба прыняць усе меры да таго, каб гэта пастанова знайшла хутчэйшае праламленьне ва ўсіх партыйных, прафсаюзных, савецкіх і каапэрацыйных арганізацыях.

У рэзультаце атрыманых партыяй перамог на ўсіх франтох сацыялістычнага будаўніцтва, каапэрацыя, як адно з важнейшых зьвёньняў, дабілася відавочных посьпехаў. Але гэтыя посьпехі ні ў якай ступені не даюць нікому права на іх заспакойвацца. Задачы, пастаўленыя партыяй, патрабуюць ад каапэрацыі рашучай перабудовы работы. Трэба падцягнуць тэмпы работы каапэрацыі да агульных тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Пад кіраўніцтвам партыі, у рашучай барацьбе з усякага роду апартуністычнымі скажэньнямі прыняцьпяў савецкага, калгаснага гандлю, каапэрацыйныя арганізацыі перабудуюць сваю работу ў адпаведнасьці з тымі задачамі, якія пастаўлены перадамі сацыялізму.

КОЖНЫ ДЗЕНЬ ЗАЦЯГВАНЬНЯ СЕНАЎБОРКІ—ГЭТА СТРАТЫ ТЫСЯЧ ЦЭНТНЭРАЎ КАШТОЎНЕЙШЫХ КАРМОЎ

Раўняцца па Менскім раёне, які вышаў на першае месца па ўборцы сенажацяй

ЧОРНАЯ ДОШКА

За гапебныя тэмпы на сенажацях, за зрыў тэрмінаў сенаўборкі, за няўменьне мабілізаваць масы калгасьнікаў, бедняко́ў і серадняко́ў — адказасобнікаў на стварэньне кармовай базы, накідаем на чорнай дошцы пастуўныя раёны:

Па паўднёвай зоне:

1. **Рэчыцкі** — 9,3 проц., 2. **Чачэрскі** — 10,8 проц., 3. **Брагінскі** — 14,7 проц., 4. **Гомельскі** — 24,1 проц., 5. **Мазырскі** — 28,2 проц.

Па цэнтральнай зоне:

1. **Прапойскі** — 11,7 проц., 2. **Чырвонапольскі — 29,7 проц.**

Па паўночнай зоне:

1. **Чашніцкі** — 19,5 проц.

За апартуністычныя тэмпы сенаўборкі, дадаткова заносім на чорную дошку наступныя раёны, якія за апошнія 5 дзён не дабіліся амаль ніякага прыросту.

1. **Уваравіцкі** — 19,8 проц., 2. **Жлобінскі** — 25,3 проц., (пры 34,2 проц. па паўднёвай зоне), 3. **Горацкі** — 20,9 проц., 4. **Быхаўскі** — 25,3 проц. (пры 53 проц. па цэнтральнай зоне), 5. **Сураскі** — 23,7 проц. (пры 42,4 проц. па паўночнай зоне).

Зьнімаюцца з чорнай дошкі

За ліквідацыю адставаньня ў сенаўборцы зьнімаюцца з чорнай дошкі пастуўныя раёны:

1. **Пятрыкоўскі раён** (32,1 проц.), які за апошнюю пяцідзёўку па паўднёвай зоне вышаў з 22 на 17 месца і даў за пяць дзён павялічэньне пляну на 20 проц.
2. **Талочынскі** раён (41,2 проц.), які па цэнтральнай зоне за апошнюю пяцідзёўку вышаў з 35 на 25 месца.
3. **Віцебскі** раён (49,1 проц.), які па паўночнай зоне вышаў з 14 на 5 месца.
4. **Бешанковіцкі** раён (42,3 проц.), вышаў з 13 на 8 месца.
5. **Расонскі** раён (35,1 проц.), вышаў з 17 на 10 месца.

Асабліва адзначаем зьнімцьце з чорнай дошкі Віцебскага раёну, які за 5 дзён даў прыросту на 36,1 проц.

Перад раёнамі, якія зьнімаюцца з чорнай дошкі самае цяжкае па выкананьні пляну ўсё яшчэ застаецца наперадзе. Не аслабляючы, а наадварот яшчэ больш узмацняючы тэмпы касьбы, партарганізацыі ў бліжэйшую пяцідзёўку павінны прыйсьці да канчатковых перамог на сенажацях з 100 проц. выкананьнем пляну сенаўборкі.

КАНДЫДАТЫ НА ЧЫРВОНУЮ ДОШКУ

У сьпісе кандыдатаў па чырвоную дошку застаюцца:

1. **Смалявіцкі** раён — 84,4 проц., 2. **Чэрвеньскі** — 82,5 проц., 3. **Бярэзінскі**—80,5 проц., 4. **Бялыніцкі** — 79,3 проц., 5. **Вузьдзенскі**—78,9 проц., 6. **Чавускі** — 68,3 проц., 7. **Пухавіцкі** — 63,7 проц.

Дадаткова заносім у сьпіс кандыдатаў на чырвоную дошку:

1. **Менскі раён** — 96,7 проц., **Клімавіцкі**—77,8 проц., 3. **Лагойскі**—77,1 проц. 4. **Заслаўскі** — 71,7 проц., 5. **Церахаўскі**—64,9 проц., 6. **Аршанскі** — 64,9 проц., 7. **Бабруйскі** — 60,5 проц., 8. **Рагачоўскі**—58,7 проц., 9. **Лёзьнянскі** — 55,6 проц.

За аслабленьне тэмпаў на сенажацях зьнімаецца з кандыдатаў на чырвоную дошку **Шклоўскі** раён, які за апошнія 5 дзён даў ні аднаго процанту прыросту.

Па БССР убрана 175 тыс. га азімых

Па ўсіх раёнах БССР разгарнулася масавая ўборка азімых. На 25 ліпеня ўбрана 175 тыс. га—14 проц. азімага кліну. Рад раёнаў паказваюць узорныя прыклады барацьбы за ўшчыльненьня тэрміны ўборкі. Так, КАМАРЫНСКІ раён ужо ўбраў 86,3 проц. азімых, БРАГІНСКІ—64 проц., РАГАЧОЎСКІ—59,9 проц. і ХОЙНІЦКІ—50 проц.

Побач з уборкай азімых разгортваецца і ўборка раньніх яравых. На 25 ліпеня ўжо ўбрана 24.821 гэкт. яравых.

Сена псуецца і расьцягваецца

Саўгас імя XVI партзьезду Клімавіцкага раёну, з прычыны адсутнасьці пастаянных вытворчых брыгад, абязьлічкі і ўраў пілаўкі скончыў веснавую сяўбу з значным спазьненьнем пры дрэнным якасьці апрацоўкі глебы.

Кіраўніцтва саўгасу ўрокаў сяўбы ня ўлічыла, сенаўборку саўгас пачаў таксама непадрыхтаваным. Па сенажацях не арганізаваны пастаянныя вытворчыя брыгады.

Раённыя арганізацыі павінны праверыць прычыны адставаньня саўгасу і дапамагчы яму арганізаваць работу на сенажацях.

П. Г.

Сенажорка (калгас імя X-цігодзьдзя Чырвонай армыі, Магілеўскага раёну).

ЗВОДКА НКЗБ

аб ходзе ўборкі натуральных сенажацяй і шматгадовых траў па БССР на 25 ліпеня 1932 г.

НАЗВА РАЁНАЎ	Уборка натуральн. сенажацяй: Скошана ў проц. да плян.	Убрана ў проц. да скош.	Уборка сеяных траў: Скошана ў проц.	Убрана ў проц. да скош.
Паўднёвая зона				
1. Перахаўскі	64,9	82,6	44,2	100
2. Бабруйскі	60,5	97,5	92,2	100
3. Рагачоўскі	68,7	68,2	138,6	100
4. Старобінскі	44,9	87,1	105,4	100
5. Тураўскі	44,1	71,7	113,6	100
6. Любаньскі	42,8	75,7	70,2	86,3
7. Кармянскі	42,4	41,0	103,5	59,4
8. Б.-Кашалеўскі	40,3	—	—	—
9. Глускі	39,0	78,1	155,0	100
10. Парыцкі	39,0	69,3	101,0	100
11. Жыткавіцкі	37,4	—	—	—
12. Камарынскі	35,0	—	119,3	—
13. Хойніцкі	34,1	98,2	89,6	—
14. Лельчыцкі	34,0	92,9	73,2	100
15. Веткаўскі	32,2	—	148,8	—
16. Нараўлянскі	32,2	87,3	67,8	100
17. Пятрыкоўскі	32,1	55,1	37,7	100
18. Лоеўскі	32,0	—	109,6	—
19. Мазырскі	28,2	72,6	42,1	—
20. Жлобінскі	25,3	71,2	90,5	98,8
21. Гомельскі	24,1	64,1	53,9	100
22. Ельскі	22,4	69,0	140,0	100
23. Уваравіцкі	19,8	39,5	75,1	—
24. Брагінскі	14,7	—	—	—
25. Чачэрскі	10,8	—	73,6	—
26. Рэчыцкі	9,3	56,1	70,4	—
Усяго па зоне	34,2	62,8	81,0	67,4
Цэнтральная зона				
1. Менскі	96,7	90,8	99,8	100
2. Смалявіцкі	84,4	100	94,3	100
3. Чэрвеньскі	82,5	100	144,2	100
4. Бярэзінскі	80,5	95,5	39,0	100
5. Бялыніцкі	79,3	—	94,5	—
6. Вузьдзенскі	78,9	86,1	63,4	97,2
7. Клімавіцкі	77,8	97,1	106,4	94,9
8. Лагойскі	77,1	100	80,7	100
9. Заслаўскі	71,7	92,1	74,5	70,3
10. Чавускі	68,3	85,1	58,9	100
11. Ч.-Слабодзкі	65,5	88,7	149,1	64,7
12. Пухавіцкі	63,7	88,5	117,2	—
13. Койданаўскі	63,0	93,7	132,4	128,2
14. Плешчаніцкі	61,2	91,8	101,1	95,6
15. Магілеўскі	60,4	69,1	72,6	100
16. Мсьціслаўскі	59,4	75,0	101,8	92,7
17. Капыльскі	56,5	96,5	91,6	94,8
18. Шклоўскі	56,3	97,3	118,8	98,9
19. Крупскі	56,2	—	—	—
20. Барысаўскі	49,3	89,3	64,7	100
21. Бягомльскі	48,0	82,9	32,0	100
22. Ст.-Дарожскі	45,4	72,3	46,7	92,2
23. Крычаўскі	42,9	—	41,7	—
24. Чэрыкаўскі	42,0	63,3	91,7	78,7
25. Клічаўскі	41,7	83,0	111,6	100
26. Талочынскі	41,2	100	84,2	—
27. Асіповіцкі	38,2	—	128,1	—
28. Слуцкі	37,2	66,9	156,2	94,4
29. Касьцюковіцкі	34,1	100	69,6	100
30. Ч.-Польскі	29,7	75,6	125,2	100
31. Быхаўскі	25,3	—	115,8	—
32. Горацкі	20,9	95,5	79,3	94,2
33. Прапойскі	11,9	59,4	90,9	100
Усяго па зоне	54,0	76,7	96,5	76,8
Паўночная зона				
1. Аршанскі	64,9	70,6	98,2	100
2. Лёзьнянскі	55,6	89,0	76,8	92,3
3. Сіроцінскі	53,8	98,8	232,2	100
4. Вушацкі	53,0	—	124,8	—
5. Віцебскі	49,1	84,1	129,5	86,6
6. Сеньненскі	45,9	—	78,5	—
7. Полацкі	45,2	97,5	47,5	79,6
8. Бешанковіцкі	42,3	82,7	127,0	100
9. Дубровенскі	39,7	45,6	80,3	100
10. Расонскі	35,1	97,3	87,5	69,0
11. Лепельскі	34,1	90,2	44,6	100
12. Гарадоцкі	33,0	78,5	41,0	37,4
13. Дрысенскі	29,2	88,6	133,5	89,6
14. Сураскі	23,7	17,4	106,3	—
15. Чашніцкі	19,5	69,8	54,4	86,6
Усяго па зоне	42,4	69,0	86,9	77,7
УСЯГО ПА БССР	42,9	71,8	91,3	76,8

Заўвага: Зводка складзена па 74 раёнах. Па Асьвейскім раёне весткі не атрымана спачатку кампаніі.

Кіраўнік пасеўбюро НКЗБ—**Таасевіч.**

Абязьлічка ў скарыстаньні машын, рабочай і цягавай сілы—прычыны адставаньня Віцебшчыны

ВІЦЕБСК. 12 тыс. га сенажаці па Віцебшчыне яшчэ чакаюць касцоў. У Віцебскім раёне на сёньняшні дзень няма ніводнага калгасу, які скончыў сенаўборку поўнасьцю. Нават самыя моцныя калгасы, як імя Чарвякова, «Бяроза», імя Чырвонай армыі і інш., скасілі сенажаці напалову.

Дзе-ж прычыны таго, што Віцебшчына была намі занесена на чорную дошку за марудныя тэмпы сенаўборкі? Ніжэй мы прыводзім рад фактаў, якія з усёй яскравасьцю даюць на гэта вычарпальны адказ.

Вялікае значэньне для пасьпяховага разгортваньня касьбы мае правільная расстаноўка рабочай сілы. Практыка работы значнай часткі калгасаў паказвае, што на гэта вузлавое зьвяно сенаўборкі тут зусім не зварачалі ўвагі. У выніку наглядаюцца факты калі кваліфікаваная рабочая сіла скарыстоўваецца не па спэцыяльнасьці на іншых работах, калі ў аднэй брыгадзе ліпкі рабочай сілы, а ў другой—недахват.

Напрыклад, у калгасе **«Парыская камуна»** ў брыгадзе **Махавеева** з 24 працаздольных мужчын косяць толькі 7, рэшта скарыстоўваецца на іншых работах, якія з посьпехам могуць выканаць падросткі, або непрацаздольныя.

У калгасе **імя Калініна**, у брыгадзе **Абрамава** людзей не хапае, а ў брыгадзе **Семяніхі** ёсьць лішкі рабочай сілы. У калгасе **«Сілач»** шмат працаздольных калгасьнікаў нейкім чынам аказаліся ў якасьці работнікаў канцылярыі. Калгасныя канюхі—зусім працаздольныя людзі, ня прымаюць ніякага ўдзелу ў сенаўборцы.

Зусім нерацыянальна скарыстоўваюцца складаныя машыны. У калгасе «Сілач», напрыклад, уборачныя машыны не прымаюцца да пэўных калгасьнікаў. Гэта прывяло да таго, што 4 сенакасілкі пасаваліся. А людзі, якія знаёмы з машынамі, як калгасьнік **Шпынёў** і інш., сядзяць у канцылярыі.

У калгасе імя Чарвякова замест 20 гадзін сенакасілкі працуюць па 6-7. У калгасе «Бяроза», замест 2½ га ў зьмену машына скошвае 1-1 з паловаю га. У калгасе імя Дзяржынскага сенакасілкі не скарыстоўваюцца толькі таму, што праўленьне не падрыхтавала людзей, якія-б былі знаёмы з машынамі. Не хапае і ручных кос.

Такая-ж абязьлічка наглядаецца і ў карыстаньні цягавай сілай. Гэта абязьлічка ўжо прывяла да таго, што ў радзе калгасаў частка конскай цягавай сілы вышла са строю. Напрыклад, у калгасе «Прагрэс» за апошнія тыдні з прычыны дрэннага догляду ў брыгадах № 1 і № 5 вышлі са строю лепшыя коні. У калгасе імя Молатава калгасьнік **Сьмірнёў** паехаў у горад і п'яны загнаў каня. Такія-ж факты мелі месца ў калгасе **«Бальшавік»**. У большасьці калгасаў коняй, занятых на сенакасілках і на возцы сена, як сьлед ня кормяць.

На працуцыйнасьці працы атмоўна адбіваецца несвачасовы запіс працадзён у працоўныя кніжкі калгасьнікаў. Напрыклад, у калгасе імя Калініна ў брыгадзе **Брылевіча** працоўныя кніжкі не запаўніліся ўжо на працяту месяца, у калгасе імя Сталіна—працадні зашсываюцца толькі 2 разы ў месяц. Брыгадзір **Лук'янаў** (калгас «2-я бальшавіцкая вясна») па некалькі тыдняў не запісвае брыгадзе працадні.

Зусім не зварачаецца ўвагі ў часе сенаўборкі на барацьбу са стратамі. У калгасе імя Калініна з-за нядбайнасьці брыгады **Машэры** сена клалі ў цуню вільготным. 500 пуд. сена ўжо згніло. У калгасе імя Сталіна дахі пунь не адрамантавалі своечасова, складзенае туды сена зараз псуецца ад дажджу. Старшыня калгасу імя Молатава Рудкін выступае супроць сушкі сена.

Гарадзкі камітэт партыі ў сваёй пастанове ад 26 ліпеня прызнаў, што «Зьвязда» зрабіла правільна, калі занесла Віцебскую на чорную дошку за марудныя тэмпы сенаўборкі. Гаркомам прынят рад канкрэтных мер для хутчэйшага скончэньня сенаўборкі. На вёску накіраваны 25 адказных работнікаў. Раённая газэта «Віцебскі пралетары» накіравала ў калгасы спэцыяльную брыгаду. Трэба спадзявацца, што Віцебшчына ў бліжэйшыя дні ліквідуе свае адставаньне.

Брыгада «Зьвязды»: **А. Зярубежны, Ф. Сурганаў, Р. Вярхоўскі.**

АД РЭДАКЦЫІ: Паводле атрыманых намі дадатковых вестак, Віцебшчына за апошнія дні ўзьняла тэмпы касьбы. Уга скошана 49,1 проц. сенажацяй.

Аб міжнародным антываенным дні 1 жніўня

(Пастанова ЦК КП(б)Б ад 25 ліпеня 1932 г.)

1. У сувязі з правядзеньнем кампаніі, прысьвечанай міжнароднаму антываеннаму дню 1 жніўня, ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партарганізацыям і ячэйкам КП(б)Б безадкладна разгарнуць палітычную работу па дэтальным асьвятленьні і растлумачэньні сярод партыйных і камсамольскіх мас, працоўных гораду і вёскі міжнароднага становішча, чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва і асабліва ў галіне павышэньня абароназдольнасьці нашай краіны.

Асноўнымі момантамі ў растлумачальнай рабоце павінны быць:

а) характарыстыка найглыбейшага ўсеагульнага крызісу капіталізму, паглыбленьне і абвастрэньне ўсіх супярэчнасьцяй капіталістычнай сыстэмы і на фоне гэтага крызісу павінны быць паказаны магутныя посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ў СССР і БССР;

б) падкрэсьліць, што імпэрыялізм шукае выхаду з крызісу шляхам узмацненьня пад рыхтоўкі новай імпэрыялістычнай вайны і ў першую чаргу шалёнай падрыхтоўкі контр-рэвалюцыйнай вайны супроць Савецкага саюзу. Адгэтуль рост узбраеньняў, абвастрэньне ваеннай небясьпекі, прыкрываны ілюзыямі пацыфісцкімі разважаньнямі.

Разам з гэтым з асаблівай сілай падкрэсьліць паўхільную палітыку міру, якой на працягу ўсяго часу цьвёрда і пасьлядоўна прытрымліваецца Савецкі саюз;

в) дэтальнае высьвятленьне абвастрэньня клясавых супярэчнасьцяй у краінах капіталу, паступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы, рост беспрацоўя, галечы і эксплёатацыі—фашызацыі дзяржапарату, правядзеньне нячуванага белага тэрору супроць рэвалюцыйных рабочых і брацкіх камуністычных партый.

На канкрэтных матар'яле азнаёміць з нарастаньнем рэвалюцыйнага крызісу і абвастрэньнем клясавай барацьбы ў Нямеччыне, Бэльгіі, Польшчы, Гішпаніі, Кітаі, геройную барацьбу пралетарыяту на чале з камуністычнай партыяй. Падкрэсьліць здрадніцкую ролю сацыял-фашыстаў па чале з II інтэрнацыяналам.

Асаблівую ўвагу зьвярнуць на характарыстыку становішча ў Польшчы і Заходняй Беларусі.

Фашызацыя дзяржапарату Польшчы, гіганцкія выдаткі на ваенныя патрэбы, арганізаванае наступленьне на жыцьцёвы ўзровень рабочай клясы, жорсткі нацыянальны ўціск, нячуваны белы тэрор, актывізацыя белагвардзейшчыны—усё гэта паасобныя зьвёньні ў падрыхтоўцы інтэрвэнцыі супроць Савецкага саюзу.

Падкрэсьліць абвастрэньне клясавай барацьбы польскага пралетарыяту, якое знаходзіць свой выраз у магутным забастоўчым руху, палітычных стачках, у рэвалюцыйным выступленьні сялянства і якое сьведчыць аб хуткім нарастаньні рэвалюцыйнага крызісу ў Польшчы. На чале гэтай барацьбы стаіць КПП і КПЗБ, якія вядуць пралетарыят да ўзброенай барацьбы за ўладу.

Супроць пастаўіць па канкрэтных прыкладах посьпехі нацыянальна-культурнага будаўніцтва ў БССР, як вынік правільнага правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, заняпаду гаспадаркі, прыгнечанью беларусаў і нацменшасьцяй у Заходняй Беларусі.

II. Кампанія, прысьвечаная 1 жніўня, павінна быць узьнята на такую вышыню, каб паслужыць магутным фактарам інтэрнацыянальнага выхаваньня і мабілізацыі мас на выкананьне гаспадарча-палітычных задач 4-га заключнага году пяцігодкі.

III. ЦК КП(б)Б прапануе ўсім партарганізацыям і ячэйкам:

1. Правесьці сходы райпартактыву, прысьвечаныя 1 жніўня, азнаямленьне з міжнародным становішчам і чарговымі задачамі сацыялістычнага будаўніцтва.

2. Правесьці на прадпрыемствах, у саўгасах і калгасах палітдні, прысьвечаныя 1 жніўня.

3. Правесьці спэцыяльныя гутаркі на фабрычна-заводзкіх і калгасных брыгадах.

4. Скарыстаць у выхадны дзень 1 жніўня паркі, сады і г. д. для масава-палітычных інсцэніровак, прысьвечаных міжнароднаму антываеннаму дню.

5. У мэтах інструктажу агітатараў, дакладчыкаў і г. д. правесьці інструктыўныя сходы партактыву ў Менску, Гомелі, Віцебску, Магілеве, Бабруйску, Барысаве, Воршы, Рэчыцы.

6. Даручыць агітмасаваму аддзелу ЦК КП(б)Б выпусьціць спэцыяльны нумар «Блёкнот агітатара», прысьвечаны 1 жніўня.

7. Абавязаць Белдзяржкіно падабраць для дэманстрацыі 1 жніўня фільмы, накіраваныя супроць імпэрыялістычных войнаў, інтэрвэнцый супроць Савецкага саюзу, фільмы, якія паказваюць рэвалюцыйную барацьбу ў краінах капіталізму.

НАДЗВЫЧАЙНАЯ ТАЛОЧЫНСКАЯ РАЁННАЯ ПАРТКАНФЭРЭНЦЫЯ

ТАЛОЧЫН. **(Па тэлеграфу ад нашага спэцкора).** Адбылася надзвычайная райпартканфэрэнцыя Талочынскага раёну. Канфэрэнцыя абмеркавала пытаньне аб выніках ліпеньскага аб'яднанага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б і пастанову ЦК КП(б)Б аб фактах грубейшага парушэньня рэвалюцыйнай законнасьці ў Талочынскім раёне.

З дакладам выступіў упаўнаважаны ЦК **тав. Ляўкоў.**

Канфэрэнцыя аднагалосна ўхваліла пастановы ЦК і заклікала ўсю партарганізацыю па іх неадкладнае ажыцьцяўленьне.

Нова-выбраны раённым кіраўніцтвам актыў кінуты на месцы для выпраўленьня меўшых месца ў раёне грубейш

Чарговыя задачы арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітвыхаваўчай работы партыі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Б. Ю ЖАБРОЎСКАГА на ліпеньскім пленуме ЦК КП(б)Б

I. На гістарычным рубяжы дзьвюх бальшавіцкіх пяцігодак

Таварышы! Баявое бальшавіцкае ажыцьцяўленьне зьключна важных адказных задач, пастаўленых перад партыяй на сучасным этапе разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, патрабуе далейшага ўсебаковага ўмацаваньня і ўзмацненьня арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітыка-выхаваўчай работы партыі, рашучага павароту ўсіх зьвеньняў партыйнай арганізацыі, партыйных камітэтаў, партыйных ячэек і партгруп да ўнутрыпартыйных пытаньняў, да пытаньняў масавай палітычнай работы ў масах.

Чым адзначаецца вострасьць, неадкладнасьць і катэгарычнасьць пастаноўкі пытаньня аб карэннай перабудове і рашучым ускладненьні арганізацыйна-партыйнай масавай і палітвыхаваўчай работы партыі? Перш за ўсё тымі гігантскімі, сапраўды сусьветна-гістарычнымі задачамі, якія стаяць перад партыяй як у гэтым 1932 г.— заключным годзе пяцігодкі, так і ў асаблівасьці—задачамі другой пяцігодкі—пяцігодкі пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, пяцігодкі перамаганьня перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці людзей, ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва краіны ў сьвядомых, актыўных будаўнікоў бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, так і той гігантскай рашаючай, кіруючай ролі, якую партыя займае ў сыстэме дыктатуры пралетарыяту, у клясавых баёх пралетарыяту за камунізм.

Мы пераможна ажыцьцявілі пяцігодку за чатыры гады, шчыльна падыходзім да другой пяцігодкі, стваралі подступы да другой пяцігодкі, але мы добра ведаем, і гэта з усёй катэгарычнасьцю падкрэсьліла таксама XVII з'езд партканферэнцыі, што шлях да бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва, пабудова якога зьяўляецца важнейшай асноўнай палітычнай задачай другой пяцігодкі, ляжыць праз жорсткую непрымірымую клясавую барацьбу, праз далейшае ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, а значыцца праз далейшае ўмацаваньне ленінскай партыі, гэтай галоўнай і накіроўваючай сілы дыктатуры пралетарыяту.

Адным з цэнтральных, вузлавых пунктаў марксызму-ленінізму зьяўлялася і зьяўляецца—вучэньне аб партыі—як авангардзе, палітычным правадыру, вышэйшай форме клясавага аб'яднаньня пралетарыяту, асноўнай кіруючай сіле ў сыстэме дыктатуры пралетарыяту.

Наша бальшавіцкая партыя, партыя, створаная і выхаваная Леніным, зьяўляецца не пасыўным назіральнікам ці рэгістратарам працэсу грамадзкага разьвіцьця, як аб гэтым думаюць апартуністы ўсіх масьцей.

Яна авангардам, правадыром рабочага класу, наша партыя павінна актыўна ўдзельнічаць і ўмешвацца ў працэс грамадзкага разьвіцьця, уплываць на яго, арганізаваць, накіроўваць і ўзначальваць яго ў інтарэсах рабочай клясы.

«Мастацтва кіраўніцтва ёсьць сур'ёзная справа. Нельга адставаць ад руху, бо адставаць—значыць адарвацца ад мас. Але нельга і забягаць наперад—значыць страціць сувязь з масамі. Хто хоча кіраваць рухам і захаваць разам з тым сувязь з мільённымі масамі, той павінен весьці барацьбу на два фронты і супроць адстаючых і супроць забягаючых наперад.

Партыя наша моцна і непераможна таму, што кіруючы рухам, яна ўмее захоўваць і замацоўваць свае сувязі з мільённымі масамі рабочых і сялян» (Сталін).

Барацьба Леніна, Сталіна за актыўную ўдзельную, кіруючую ролю партыі супроць правага і «левага» апартунізму ішла па ўсёй працягласьці гісторыі партыі, яна ідзе і зараз, накіроўваючыся як супроць правазапартуністычнай тэорыі самацёку і формы яе праўленьня на практыцы, так і супроць заскокаў і перагібаў «лявацкага» тыпу. Вялізарнейшае значэньне гэтай барацьбы заключаецца ў тым, што яна была і застаецца барацьбой за партыю ленінізму, за міжнародную партыю новага тыпу, за партыю, якая знаходзілася-б на ўзроўні грандыёзных патрабаваньняў, што прад'яўляюцца нашай эпохай, эпохай краху капіталізму, эпохай пралетарскай рэвалюцыі і завяршэньня перамогі сацыялізму ў СССР.

Я павінен напомніць выключную па трапнасьці, глыбіні і шырыні пастаноўку пытаньня аб шматгранных функцыях дыктатуры пралетарыяту, аб ролі значэньня партыі ў сыстэме дыктатуры пралетарыяту, дадзеную Леніным.

Характарызуючы дыктатуру пралетарыяту, як ўладу барацьбу, крывавую і бясконцую, гвалтоўную і мірную, ваенную і гаспадарчую, адміністрацыйную і педагагічную, супроць сіл і традыцый старога грамадзтва, супроць страшэннай сілы звычак мільёнаў і дзесяткаў мільёнаў (наколькі гэта задача ўзрастае і ўскладняецца ў сьвятле задач дванага пэрыяду, задач арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, сацыялістычнага пераўкаваньня калгасьніка, новага рабочага—відавочна кожнаму).

Ленін падкрэсьліваў, што «бяз партыі жалезнай і загартаванай у барацьбе, бяз партыі, якая карыстаецца давер'ем усяго прыватнага ў дадзай клясе, бяз партыі, якая ўмее сачыць за настроем масы і рабіць уплыў на яго, пасьпяхова весьці такую барацьбу немагчыма» (Ленін, т. XXV, стар. 191).

Даны пэрыяд характарны павышанымі, ускладненымі задачамі, складанай міжнароднай абстаноўкай, абстаноўкай растучай пагрозы імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі супроць СССР, бязупынымі антысавецкімі правакацыямі на Далёкім Усходзе. Наяўнасьць раду труднасьцяй—труднасьці росту нашай гаспадаркі, вялізарны рост рабочае клясы—задачы іх клясавага палітычнага пераўкаваньня патрабуюць умацаваньня і росту ролі партыі, умацаваньня партыйнага апарату, перабудовы арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітычна-выхаваўчай работы партыі, перабудовы, якая азначае, выказваючыся словамі тав. Кагановіча,—«зьмяшэньне паперы і гутарак зьверху..., больш увагі да нізавой работы, дзе робіцца сапраўдная, жывая справа сацыялістычнага будаўніцтва».

Неабходна цьвёрда і выразна запамятаць указаньне Леніна, што кіруючая, авангардная роля партыі павінна захавацца аж да вышэйшай фазы камунізму. «Адмаўляць партыйнасьць,—пісаў Ленін,—з пункту погляду камунізму значыць рабіць скачок ад папярэдняга краху капіталізму—не да ніжэйшай і не сярэдняй, а да вышэйшай фазы камунізму» (Ленін, т. XXV, стар. 190).

Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК на чале з тав. Сталіным мы ідзем гігантскімі крокамі наперад, пераможна разгортваем бальшавіцкае наступленьне.

У чым істота бальшавіцкага наступленьня ў нашых сучасных умовах, пытаў тав. Сталін на XVI зьезьдзе УсеКП(б) і адказваў:

«Істота бальшавіцкага наступленьня заключаецца па-першае, перш за ўсё ў тым, каб **мабілізаваць клясавую пільнасьць і рэвалюцыйную актыўнасьць мас супроць капіталістычных элемэнтаў нашай краіны;** мабілізаваць творчую ініцыятыву і самадзейнасьць мас супроць бюракратычных перажытых устаноў і арганізацый, якія трымае над сукном вялізарныя рэзэрвы, што тоняцца ў нізах нашага ладу і які не дае іх скарыстаць; арганізаваць спаборніцтва і працоўны ўздым мас на ўзьнёсьцё прадукцыйнасьці працы, за разгортваньне сацыялістычнага будаўніцтва.

Істота бальшавіцкага наступленьня заключаецца, па-другое, у тым, каб арганізаваць перабудову ўсёй практычнай работы прафсаюзных, кааперацыйных, савецкіх і ўсякіх іншых масавых арганізацый **прыстасоўна да патрэб рэканструктыўнага перыяду;** стварыць у іх ядро з найбольш актыўных і рэвалюцыйных работнікаў, адцясьніўшы і ізаляваўшы апартуністычныя, трэд'юніёнскія, бюракратычныя элемэнты; вычысьціць вон з іх чужыя элемэнты, якія перарадзіліся, і высунуць новых работнікаў зьнізу.

Істота бальшавіцкага наступленьня заключаецца, нарэшце, у тым, каб **мабілізаваць самую партыю для арганізацыі ўскіх справы наступленьня; умацаваць і адмежыць партыйныя арганізацыі,** выгнаўшы адтуль элемэнты бюракратызму і перараджэньня; ізаляваць і адцясьніць выразьнікаў правага і «левага» ўхілаў ад ленінскай лініі партыі, высунуўшы на першы плян сапраўдных, стойкіх ленінцаў».

На шляхох разгорнутага бальшавіцкага наступленьня ў духу дырэктыў і ўказаньняў правадыра і настаўніка партыі т. Сталіна, мы дамагліся перамог сусьветна-гістарычнага значэньня.

Фундамант сацыялістычнай эканомікі ў нашай краіне пабудаваны. Праблема «хто каго»—вырашана на карысьць сацыялізму і ў галіне прамысловасьці, і ў галіне сельскай гаспадаркі канчаткова і беспаваротна. Трацкізм, які выраджаўся ў перадавы атрад контр-рэвалюцыйнай буржуазіі, разьбіты, праваму апартунізму—галоўнай небясьпецы на даным этапе, нанесен руйнуючы ўдар. Савецкі саюз канчаткова ўмацаваўся на сацыялістычным шляху, рашучую перамогу сацыялізму трэба лічыць ужо завершанай.

І на гістарычным рубяжы дзьвёх бальшавіцкіх пяцігодак партыя з асаблівай сілай падкрэсьлівае выключна вялікае значэньне пытаньня арганізацыйна-партыйна-масавай і палітыка-выхаваўчай работы, пытаньня, якому прысьвечана тэма майго дакладу на сучасным пленуме Цэнтральнага камітэту КП(б)Б.

II. Арганізацыйна-партыйныя задачы партыі

Выключна важнае значэньне арганізацыйна-партыйнай работы найбольш яскрава і выпукла было падкрэслена тав. Кагановічам у арганізацыйнай справаздачы ЦК УсеКП(б) на XVI партзьезьдзе. Тав. Кагановіч, аналізуючы нашы гігантскі посьпехі на фронце разгорнутага сацыялістычнага наступленьня, з усёй рашучасьцю падкрэсьліў, што «бяз увелкага спалучэньня правільнай палітыкі з правільнай арганізацыйнай практыкай мы нізоі-б не дамаглі-б тых вялізарнейшых посьпехаў».

Трэба адзначыць, што гэта адзінства палітыкі і арганізацыі, адзінства праграмных, тактычных і арганізацыйных прынцыпаў партыі заўсёды зьяўлялася і зьяўляецца асновай бальшавізму. Трэба нагадаць указаньне тав. Сталіна аб тым, што адна з карэнных традыцый бальшавізму заключаецца ў тым, што ён быў і заўсёды застаецца непахісным ворагам стаўкі на самацёк, рашучым праціўнікам антыўнай арганізацыі рэвалюцыйнага працэсу.

Пры ўсіх наяўных у нас вельмі буйных недахопах, недахопах у пастаноўцы арганізацыйна-партыйнай, масавай палітычнай работы ў масах для кожнага з нас, хто глядзіць без апартуністычных акуляраў і бачыць рочы, зьявіцца такімі, як яны ёсьць,—зусім відавочны тым буйнейшым дадатныя зьявішчы, што характарызуюць сабою ўнутрыпартыйнае жыцьцё ячэек, рост актыўнасьці, згуртаванасьці, мабілізацыі партыйнай арганізацыі і беспартыйных працоўных мас. Толькі людзі тыпу оберонгата і паскрэбыша Троцкага—могуць у сваіх агідных, брудных, прадажных пасквілях пісаць, што нашай ленінскай партыі няма, што яе замяніў, выцясьніў «бюракратычны апарат», што ў нашай краіне—краіне магутных перамог сацыялізму—ёсьць дваёўладзьдзе. Гэтым агідным, прадажным паклёпам контр-рэвалюцыянэр Троцкі выключае сацыяльны закон тых вялічных зьмяненьняў, якія падрыхтоўваюць зьмяненьні, якія адзначаюць зьмяненьні, якія адзначаюць зьмяненьні, якія адзнача

Чарговыя задачы арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітвыхаваўчай работы партыі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Б. Ю. ЖАБРОЎСКАГА на ліпеньскім пленуме ЦК КП(б)Б

У пастаноўцы арганізацыйна-партыйнай і масава-выхаваўчай работы — рашаючае, цэнтральнае месца займае пытаньне аб авангардкай ролі камуністаў як на выхаваўчасьці, так і ва ўсім жыцьці пралетарскай грамадзкасьці ў цэлым.

Асабходна ўзяць рашучы курс на тое, каб кожны камуніст паасобку на справе стаў-бы ня толькі ўдарнікам выхаваўчасьці, але і спраўдным важаком і палітычным арганізатарам работы ў сваёй зьмене, брыгадзе, здольным растлумачваць масам лёзунгі партыі, яе посьпехі, здольным растлумачваць трудзящасьці пашага росту і шляхі іх перамаганьня.

У вялізарнай большасьці і гарадзкіх, і вясковых партыйных арганізацый мы, бязумоўна, маем значнае ўзмацненьне авангардкай ролі камуністаў і на выхаваўчасьці і ва ўсёй пралетарскай грамадзкасьці. Весь асобны факты, якія, зразумела, можна памножыць у дзесяткі і сотні раз. На Гомсельмашы з 278 партыйцаў — 262 атрымалі карткі-ўдарніка, з 207 рацыяналізатараў і вынаходцаў Гомсельмашу — 78 камуністаў. У камуністаў-фармаўшчыкоў заводу «Пралетары» (Гомель) брак хістаецца ад 1 да 3 проц., у той час, калі ў беспартыйных фармаўшчыкоў (нават больш высокай кваліфікацыі) брак хістаецца ад 6,6 да 9,3 проц.

На заводзе «Бальшавік» (Менск) у партгрупе тав. Лепіт выкананьне прамфінпляну ў сакавіку беспартыйнымі — 117 проц., камуністамі — 121,4 проц.; у красавіку беспартыйнымі — 120,4 проц., камуністамі — 129,6 проц.

Але разам з тым, я з асаблівай вострасьцю хачу падкрэсьліць, што побач з гэтымі шматлікімі яскравымі фактамі павышэньня авангардкай ролі камуністаў мы маем і факты, якія сьведчаць аб тым, што на радзе прадпрыемстваў камуністы ўсё яшчэ не зьяўляюцца важакамі як на выхаваўчасьці, так і ў грамадзкім жыцьці.

Так, на віцебскай фабрыцы імя Клары Цэткін, пры валўнасьці партыйнай праслойкі ў 15 проц. (у адносінах да ўсёй масы рабочых), камуністы-ўдарнікі складаюць усяго толькі 6,97 проц. агульнага ліку ўдарнікаў.

З указаных недахопаў вынікаюць тыя задачы, якія павінны перад намі стаяць у справе ўзьняцьця авангардкай ролі камуністаў.

Кожнае зьвяно партыйнай арганізацыі па вінна выканаць указаньне XVI зьезду УсеКП(б) аб пагалоўным стопроцантным уцягненьні камуністаў у сацыяборніцтва і ўдарніцтва з тым, каб на падставе асабістага паказу, асабістага прыкладу кожнага камуніста ў паасобку ўзьняць авангардную ролю камуніста, яшчэ больш згуртаваць беспартыйных рабочых вакол нашай партыі.

Кожны камуніст павінен быць баявіком, ударнікам у барацьбе за бальшавіцкае ажыцьцяўленьне гаспадарчага разрахунку, кожны камуніст павінен быць застрэльшчыкам у справе аўладаньня тэхнікай, у справе хутчэйшага ажыцьцяўленьня ўсіх 6-ці гістарычных умоў тав. Сталіна, у справе барацьбы за ўсё тое, што складае сабой генэральную лінію партыі бальшавікоў.

Задачы гэтай ці іншай арганізацыі, — адзначыў тав. Кагановіч у сваім выступленьні на IX зьезьдзе прафсаюзаў, — павінна адпавядаць **ў першую чаргу тым**, наколькі прафсаюз зьвязан з масай, ведае настрой рабочых, умее арганізаваць рабочых і весьці іх па правільным шляху, колькі паступае скаргаў, заяў, зваротаў рабочых, як яны вырашаны прафарганізацыяй. З усіх відаў прафсаюзнай статыстыкі самы неабходны — гэта ўлік выпікаў рабочых лістоў, заяў, прапаноў, скаргаў.

Становішча-ж масавай работы і ў горадзе і асабліва на вёсны гусіне нездавальняючае. Гэтымі днямі перад пленумам ЦК па горадзе Менску мы правялі па прадпрыемствах рад нарад з паасобнымі групамі партыйцаў, кандыдатаў партыі і беспартыйных рабочых — так званых «пасьвістаў», г. зн. нарады камуністаў, якія ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў партыйнай, грамадзкай рабоце, не наведваюць сходаў, не наведваюць школ, ня чытаюць газэт, ня маюць нагрузак. І вось на гэтых сходах з усёй відавочнасьцю выявілася надзвычайная пязграбнасьць, няўменьне раду нашых паасобных партыйных ячэек, паасобных партыйных арганізацый наладзіць работу з жывымі людзьмі — будаўнікамі сацыялізму, няўменьне паставіць масавую работу не абязьлічана, а на падставе ўліку запатрабаваньняў, дыфэрэнцыяванага падыходу да жывога, канкрэтнага чалавека — будаўніка сацыялістычнага грамадзтва.

Вось што, да прыкладу, расказаў па адной са скліканых намі нарад рабочы заводу імя Молатава — тав. Верамеєў:

— Зусім дрэнна ў нас з растлумачэньнем раду пытаньняў работы каапэрацыі. За два апошнія гады я памятаю толькі два сходы — адзін у мінулым годзе наконт таго, што абязьлічанасьцю, неканкрэтнасьцю прымаемых пастаноў, за сапраўдную апэрацыйную, глыбока сыстэматычную работу, — наша адна з важнейшых задач.

Якасьць работы кожнай партыйнай групы, размах яе работы, апэрацыйнасьць — павінна быць узьнята на ўзровень тых адказьнейшых задач, якія прад'яўляюцца пэрыядам разгорнутага па ўсім фронце сацыялістычнага наступленьня.

Увага, кіраўніцтва, штодзенная дапамога, абагуленьне вопыту, — вось што патрабуецца ад кожнай партыйнай арганізацыі ў справе паляпшэньня работы партыйных груп — гэтага важнейшага зьвяна партыйнай работы.

Масавая работа на прадпрыемствах, у цэху—адзін з важнейшых вучасткаў партыйнай работы

Можна сьмела сказаць, што нікоці пытань ні масавай работы, пачынні ахопу нашым арганізацыйным і палітычным уплывам найшырэйшых рабочых, калгасных мас, уключна да самых адсталых рабочых, калгаснікаў, — не адыгрывалі такога выключна вялікага значэньня, як у даны перыяд, і пераканаўча, што ў апошніх выступленьнях кіраўнікоў партыі гэтыя пытаньні заваструюцца з усёй вострасьцю і катэгарычнасьцю.

Тав. Сталін з выключнай выразнасьцю паставіў перад партыяй пытаньне аб узмацненьні ўвагі да запатрабаваньняў рабочых: «Пабольш увагі і ўдумлівасьці да запатрабаваньняў рабочай клясы, паменш бюракратычнага фармалізму ў практыцы нашых партыйна - прафэсыянальных арганізацый, **пабольш чуласьці, адзыўлівасьці да пачуцьця клясавай вартасьці рабочай клясы — такая цяпер задача».**

Нема патрэбы падкрэсьліваць, што правядзеньне ў жыцьцё гэтых указаньняў тав. Сталіна патрабуе разгортваньня масавай работы, яшчэ большага ўзмацненьня сувязі з рабочай клясай, з прадоўнымі масамі.

— **Работа тэй ці іншай арганізацыі,** — адзначыў тав. Кагановіч у сваім выступленьні на IX зьезьдзе прафсаюзаў, — павінна ацэньвацца **ў першую чаргу тым,** наколькі прафсаюз зьвязан з масай, ведае настрой рабочых, умее арганізаваць рабочых і весьці іх па правільным шляху, колькі паступае скаргаў, заяў, зваротаў рабочых, як яны вырашаны прафарганізацыяй. З усіх відаў прафсаюзнай статыстыкі самы неабходны — гэта ўлік выпікаў рабочых лістоў, заяў, прапаноў, скаргаў.

Становішча-ж масавай работы і ў горадзе і асабліва на вёсны гусіне нездавальняючае. Гэтымі днямі перад пленумам ЦК па горадзе Менску мы правялі па прадпрыемствах рад нарад з паасобнымі групамі партыйцаў, кандыдатаў партыі і беспартыйных рабочых — так званых «пасьвістаў», г. зн. нарады камуністаў, якія ня прымаюць актыўнага ўдзелу ў партыйнай, грамадзкай рабоце, не наведваюць сходаў, не наведваюць школ, ня чытаюць газэт, ня маюць нагрузак. І вось на гэтых сходах з усёй відавочнасьцю выявілася надзвычайная пязграбнасьць, няўменьне раду нашых паасобных партыйных ячэек, паасобных партыйных арганізацый наладзіць работу з жывымі людзьмі — будаўнікамі сацыялізму, няўменьне паставіць масавую работу не абязьлічана, а на падставе ўліку запатрабаваньняў, дыфэрэнцыяванага падыходу да жывога, канкрэтнага чалавека — будаўніка сацыялістычнага грамадзтва.

Вось што, да прыкладу, расказаў па адной са скліканых намі нарад рабочы заводу імя Молатава — тав. Верамеєў:

— Зусім дрэнна ў нас з растлумачэньнем раду пытаньняў работы каапэрацыі. За два апошнія гады я памятаю толькі два сходы — адзін у мінулым годзе наконт таго, што неабходна было адпрацаваць 300 дзён на праполцы і такі-ж у гэтым годзе.

Або вось як малое стаў масавай работы па хлебазаводзе рабочы тав. Кароткі:

— У нас вельмі мала асьвятляецца на заводзе міжнародзнае становішча, цікавасьць да якога ў многіх рабочых, у тым ліку і ў мяне, вельмі мяркая. Пытаньні на палітычныя тэмы на партсходзе ставяцца толькі тады, калі гарком прысылае сваіх прадстаўнікоў для правядзеньня розных кампаній.

Возьмем завод імя Молатава ў Менску. Партыйцы-рабочыя гэтага заводу не маглі пазваць прозьвішча сакратара свайго заводзкага партыйнага калектыву, яны ня ведаюць сакратароў вышэйшых ячэек, ні старшынь вышэйшых камітэтаў.

Нікольі слаба настаўлена масавая работа, паказвае наступны факт:

Беспартыйны рабочы заводу імя Молатава тав. Зуеў сказаў па прапанову падпісацца на газэту: «Дабра, я падпішуся, але скажэце, чаму вы тут мяне не заўважылі на працягу году? Цяпер я хачу, каб вы да мяне падышлі разы два-тры».

У часе правядзеньня гэтых гутарак з «пасьвістамі», мы задалі ім рад пытаньняў.

Старшыня аднаго цэхпрафбюро заводу імя Молатава на запытаньне аб тым — хто такі тав. Молатаў — адказвае:

— Не ўяўляю сабе (сьмех).

Гэта член партыі, скончыўшы школу, ды лічыўся прыкладным вучнем і ледзь граматы не атрымаў.

— Вы аб Рудзутаку чулі?

— Чула, але забылася хто ён такі.

Гэтыя адказы — лепшы паказальнік слабай, нездавальняючай пастаноўкі па радзе прадпрыемстваў нашай сыстэматычнай масавай і палітычна-выхаваўчай работы.

Трэба з усёй вострасьцю проста сказаць, што калі гэтыя таварышы лічацца ў «пасьве», дык гэта віна наша, віна партыйных ячэек. Трэба арганізаваць так работу з кожным паасобным камуністам, каб у нас у арганізацыі кожны партыец сапраўды, на справе ва ўсёй штодзённай рабоце зьяўляўся вважаком шырокіх рабочых мас.

Зразумела, што гэта ў адпалькавай меры адносіцца і да вёскі.

Веданьне жывых людзей — будаўнікоў сацыялістычнага грамадзтва, веданьне іх настрояў, рэагаваньне на настрої, чулае рэагаваньне на скаргі, заявы, штодзённая сувязь з рабочымі, калгаснікамі, на прадпрыемстве, дома, у клюбе, на полі, веданьне іх запатрабаваньняў, уменьне ўваходзіць у самыя маласкія так званыя «дробязі быту», якія зьяўляюцца ня дробязямі, а буйнымі, важнымі пытаньнямі, як сталоўка, ЗРК, чырвоны куток, медпункт, ясьлі, ажыцьцяўленьне тэхнікі бясьпечнасьці і г. д.—усе гэтыя пытаньні павінны быць у цэнтры нашага штодзённага ўплыву і ўзьдзейнасьці.

Паставім на-бальшавіцку справу палітычнай агітацыі і прапаганды

Прыток на прадпрыемства новых пластоў рабочых, прыход на фабрыкі і заводы выхадцаў з вёскі, з гарадзкой дробнай буржуазіі, ставіць з усёй вострасьцю пытаньне аб узмацненьні нашай палітычнай работы, палітычнай агітацыі ў першую чаргу.

Агульнавядома тое вялізарнае значэньне, якое партыя надавала агітацыі на працягу ўсёй сваёй гісторыі.

Ленін ня раз падкрэсьліваў вялізарнае значэньне агітацыі і прапаганды. «Кожны агітатар,—гаварыў Уладзімер Ільіч,—павінен быць дзяржаўным кіраўніком усіх сялян і рабочых у справе эканамічнага будаўніцтва. Уся прапаганда павінна быць пабудавана на палітычным вопыце гаспадарчага будаўніцтва. Наша галоўная палітыка зараз павінна быць — эканамічнае будаўніцтва дзяржавы, каб сабраць лішнія пуды збожжа, каб даць лішнія пуды вугалю. І на гэтым павінна быць прыладжана ўся агітацыя і прапаганда».

Асабліва ў даны перыяд неабходна рашуча ўзмацніць ролю і значэньне палітычнай агітацыі. Я ня буду спыняцца на фактах агідна дрэннай арганізацыі ў радзе месц нашай агітацыі, калі зьмест часта ўхітраюцца выпустошыць, палітычная агітацыя робіцца бяззубай, калі часам агульныя рабочыя сходы, мітынгі праходзяць без папярэдняй глыбокай падрыхтоўкі, па трафарэту і г. д.

Зусім зразумела, што зьмест палітагітацыі ад пачатку да канца азначаецца генэральнай лініяй партыі, азначаецца дырэктывамі і пастановамі партыі.

Агітатар павінен ня толькі ведаць гэтыя пастановы, але ён павінен умець арганічна, непарыўна зьвязаць іх з жывым палітычным вопытам гаспадарчага і партыйнага будаўніцтва, павінен каварыць проста, ясна, зразумелай працоўнай масе мовай.

Кожны агітатар, дакладчык павінен перш за ўсё аўладаць уменьнем устанаўляць жывы, непасрэдны кантакт з масай, павінен не абыходзіць хвалюючых рабочых пытаньняў, а з бальшавіцкай простасьцю адказваць па іх, мабілізуючы масы на барацьбу за генэральную лінію партыі, на барацьбу за выкананьне канкрэтных задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Паўтараю яшчэ раз, што масавая палітычная агітацыя зьяўляецца ў даны момант найбольш слабым участкам партыйна-масавай работы на вытворчасьці. Растлумачэньне карэнных і бягучых гаспадарчых і палітычных пытаньняў (рэалізацыя 6 указаньняў тав. Сталіна аб барацьбе з бракам, з прастоямі, аб цэнах і г. д.) многія партыйныя арганізацыі ня ўмеюць ўзьнімаць на прынцыповую выпышню, ня ўмеюць узвязваць дробных пытаньняў вытворчасьці з агульнымі задачамі пралетарскай дзяржавы.

Нам неабходна ва што-б тым ні стала і мы гэтага павінны дабіцца і дабіемся — узьняць якасьць усёй нашай палітычнай агітацыі на ўзровень адказьнейшых і вялізарнейшых задач сучаснага этапу сацыялістычнага будаўніцтва.

III. Задачы арганізацыйна-партыйнай і масавай работы на вёсцы

Пры налічэньні раду бязумоўна буйных дасягненьняў у рабоце вясковай часткі нашай партыйнай арганізацыі, іх ідэйным і арганізацыйным росьце, значным папаўненьні сотні сельскіх калгасных партыйных ячэек, павышэньні клясавай пільнасьці, мабільнасьці, узмацненьня кіруючай ролі вясковых партыйных ячэек у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, у справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў — цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва на даным этапе, неабходна ўсё-ж прызнаць, што сельскае нізавое зьвяно, асабліва калгасная партыйная ячэйка, зьяўляецца найбольш вузкім адсталым участкам арганізацыйна - партыйнай, масавай і палітыка-выхаваўчай работы партыі.

У цэнтры ўвагі як пленуму ЦК, так і работы КП(б)Б, пачынаючы ад ЦК, РК і канчаючы сельскімі ячэйкамі павінна быць пастаўлена задача ўсямернага і ўсебаковага ўмацаваньня вясковай часткі нашай партыйнай арганізацыі.

Даўно ўжо час рэшуча узяцца за рэалізацыю і ў бліжэйшы тэрмін разгорнута рэалізаваць важнейшыя ўказаньні т. Кагановіча, якія ён зрабіў 2 гады таму назад на XVI зьезьдзе УсеКП(б) аб стварэньні моцнай, баяздольнай партыйнай арганізацыі на вёсцы.

На пленуме ЦК з усёй катэгарычнасьцю і бальшавіцкай самакрытыкай заваструў увагу ўсёй КП(б)Б на тых галоўнейшых недахопах і праблемах, якія ёсьць ў практыцы работы вясковых, у асабліва сьці калгасных і саўгасных партыйных ячэек, а таксама на тых [illegible] кіраўніцтва [illegible] — [illegible] — [illegible] — [illegible]

сім нецярпімыя, недапушчальныя элемэнты камандаваньня, адміністрацыйнага самаўпраства ў адносінах да калгаснага працоўнага сялянства ня зжыты яшчэ і да гэтага часу ў радзе раёнаў БССР.

ЦК КП(б)Б моцна б'е як па «лявацкіх» перагібшчыках, так і па тых правапартыйных элемэнтах, якія пасуюць перад кулаком, плывуць на хвалях праваапартыйнага самацёку. Тыя «лявацкія» перагібы, якія мелі месца ў радзе раёнаў Б (Лельчыцы, Талачын, Барысаў і інш.), казваюць, што многія з нашых раённых сельскіх кіруючых работнікаў да гэтага часу не разумеюць элемэнтарнага палажэньня ленінізму аб адносінах да калгаснага сялянства, аб задачах арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў у іх арцельнай ва даным этапе форме.

Нашым раённым і сельскім работнікам неабходна цьвёрда і выразна зразумець, што задача арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў, задача сацыялістычнага перавыхаваньня калгаснікаў, выхаваньня кадраў беспартыйнага калгаснага актыву, задача стварэньня моцных баяздольных калгасных ячэек патрабуе ўсямернай работы па паўхідным поўным правядзеньні дырэктыў партыі і ўраду. Гэтыя пастановы зьяўляюцца разгорнутай праграмай работы вясковай партарганізацыі, асабліва калгаснай ячэйкі, у барацьбе за ўмацаваньне калгасаў, ліквідацыі «лявацкіх» перагібаў, якія мелі і яшчэ маюць месца ў калгасах, у барацьбе з правым ухілам — галоўнай небясьпекай на даным этапе, і прымірэнцтвам да ўхілаў, барацьбе з разьбітым, але яшчэ недабітым кулаком.

Гэтыя пастановы зьяўляюцца разгорнутай праграмай работы ў барацьбе за паляпшэньне якасьці с.-г. вытворчасьці, павышэньне ўрадкайнасьці, арганізацыю павышэньня прадукцыйнасьці працы, укараненьне агратэхнікі, за бярэжлівы адносіны да калгаснай дзяржаўнай маемасьці, паляпшаючы зацікаўленасьць калгаснікаў у паняцьці калгаснай вытворчасьці, у падрыхтоўцы і пасьпяховым правядзеньні ўборачнай і збожжазагатоўчай кампаніі.

Толькі «левакі» і правыя апартуністы могуць не разумець і недаацэньваць важнасьці і неабходнасьці паўхільнай работы над ажыцьцяўленьнем гэтых задач, якія пастаўлены нашай партыяй.

Рашаючым пытаньнем калгаснага будаўніцтва на даным этапе зьяўляецца ўменьне сплучаць, увязваць грамадзкія інтарэсы калгасаў у цэлым і калгаснікаў з асабістымі, прыватнымі інтарэсамі кожнага калгаснікаў, узьняць даходнасьць калгасаў і калгаснікаў, паказаць яшчэ больш навочна вялізарныя перавагі калгаснікаў перад адноасобнікам, паўхільна павышаючы матар'яльны і культурны ўзровень калгаснікаў, узмацняючы яго пэрспэктывы.

Неабходна адзначыць тое, што зусім недапушчальнае становішча, калі нашы сельскія ячэйкі і камуністы дагэтуль нярэдка ў сваёй практычнай, штодзённай рабоце падмяняюць сабой рад арганізацый, выконваючы функцыі, якія ўскладзены на сельсавет, пракуратуру, міліцыю, крымінальны вышук, каапэрацыю, праўленьне калгасу і г. д. Само сабой зразумела, што гэта прыводзіць да адрыву камуніста ад яго непасрэдных задач па ўзначаленьні вытворча - палітычнага жыцьця на вёсцы, у калгасе, да адрыву ад мас калгаснікаў, беднякоў і сераднякоў.

З практычнай падмены ячэйкамі ўсіх прыведзеных пасаў, што злучаюць партыю з шырокімі масамі, неабходна пакончыць рашуча і беспаваротна.

Цяпер, таварышы, дазвольце перайсьці да пытаньняў непасрэднай партыйнай работы на вёсцы.

Ячэйкі МТС, саўгасаў, буйнейшых калгасаў—ператворым у асноўныя пункты партыйнай работы ў вёсцы

Важнейшым зьвяном у рабоце вясковай партарганізацыі зьяўляецца ператварэньне ячэек, МТС, саўгасаў, буйнейшых калгасаў у апорныя пункты партыйнай работы ў вёсцы.

Выходзячы з указаньняў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б, райкомы павінны былі ўмацаваць гэтыя ячэйкі, ператварыўшы іх у вядучыя, апорныя зьвенні партыйнай арганізацыі з тым, каб праз гэтыя ячэйкі наблізіць буйнае кіраўніцтва да дробных раскіданых сельскіх і калгасных ячэек, дапамагаючы апошнім сапраўды шчыльна павярнуцца тварам да вытворчасьці, аўладаць эканомікай і тэхнікай калгаснай вытворчасьці, дапамагаючы ім практычна рэалізаваць дырэктывы партыі па пытаньнях калгаснага будаўніцтва, дапамагаючы нізавым калгасным, саўгасным ячэйкам, партгрупам у спэцыфічных умовах саўгасаў, калгасаў рэалізаваць 6 гістарычных указаньняў тав. Сталіна, іх адзіную, цэльную праграму ў барацьбе за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за перабудову саўгасу, за высокія вытворчыя паказальнікі с.-г. вытворчасьці.

Між тым, пры арганізацыі апорных пунктаў у значнай колькасьці раёнаў БССР былі дапушчаны грубыя скажэньні і сырыя, ненадумныя дырэктывы партыі. З прычыны гэтых скажэньняў апорныя ячэйкі часта ператварыліся на практыцы ў новае, непатрэбнае прамежкавае зьвяно паміж калгаснай ячэйкай і райкомам партыі, ператварыліся ў так званыя апорныя «сельпартклюбы». Часта гэтыя «сельпартклюбы» арганізоўваліся пры такіх ячэйках, дзе для іх работы ня было ніякіх умоў. Так, напрыклад, у Чавускім раёне, у саўгасе «Далёкая Ніва» «сельпартклюб», як апорны пункт, быў арганізаван у ячэйцы, якая налічвае ўсяго два члены партыі і тры кандыдаты.

У Магілёўскім раёне, у саўгасе імя Сталіна «сельпартклюб» быў арганізаван у ячэйцы, якая налічвае ўсяго тры члены партыі і 6 кандыдатаў.

Вось такім слабым (з пункту гледжаньня колькаснай і якаснай) саўгасным і калгаснай ячэйкі даны бяз усякай папярэдняй работы групы кіруючых, дырэктыўных, самастойных парткомаў па кіраўніцтве бліжэйшымі саўгаснымі і калгаснымі сельскімі ячэйкамі і інш.

У выніку мы мелі такія факты, калі так званыя апорныя «сельпарткомы» выносілі пастановы аб роспуску бюро ячэек, перакідвалі самачынна партыйцаў з калгасу ў саўгас і назад, выносілі пастановы аб зьняцьці з работы старшынь праўленьняў калгасаў, дырэктароў саўгасаў, умешваліся ў работу раду суседніх сельсаветаў, заслухоўвалі даклады сельсаветаў, саўгасаў, выносілі на іх доўгія, агульнага характару рэзалюцыі і г. д. Так, напрыклад, Балашоўскі «сельпарком», Полацкага раёну, перакінуў з калгаснай ячэйкі ў саўгас рад камуністаў-калгаснікаў, заслухаў на адным сваім пасяджэньні адразу даклады трох сельскіх ячэек, спраўзадачы 9 старшынь калгасаў і ўхітрыўся прыняць на ўсіх гэтых заслуханых дакладах адну рэзалюцыю самага агульнага, расплыўлівага характару.

Апошнія пастановы ЦК КП(б)Б аб рабоце апорных ячэек, у сувязі з выяўленымі скажэньнямі ў рабоце апорных ячэек, дапамагалі як значнаму ўмацаваньню работы апорных пунктаў, так і ўнесьлі поўную даклараснасьць і якасьць у функцыі апорных ячэек, у вызначэньне іх ролі на справе ўмацаваньня партыйна - масавай работы на вёсцы.

Ёсьць ужо рад станоўчых фактаў у рабоце апорных ячэек, якія набудавалі сваю работу ў адпаведнасьці з указаньнямі ЦК КП(б)Б. Так, напрыклад, Баранчоўская апорная ячэйка Слуцкага раёну ў выніку правільнай перабудовы работы, правільнай арганізацыі працы, расстаноўкі сіл, [illegible] ліквідацыі адрыву маладнякоў (у адзьленьні тав. Кірыцак захаваў усе маладнякі, у адзьленьні тав. Сакутаць захавана 98 проц. маладнякоў). Свой станоўчы вопыт работы ячэйка саўгасу перанесла ў суседні сьвінагадоўчы саўгас «Слуцк».

(Працяг гл. на [illegible] старонцы).

Чарговыя задачы арганізацыйна-партыйнай, масавай і палітвыхаваўчай работы партыі

Даклад сакратара ЦК КП(б)Б тав. Б. Ю. Жаброўскага на ліпеньскім пленуме ЦК КП(б)Б

Аднак, побач з наяўчасцю станоўчых прыкладаў у перабудове работы апорных пунктаў, ёсьць яшчэ і зараз шмат адмоўнага. Так, напрыклад, з 61 абсьледаванай апорнай ячэйкі палову ніяк нельга назваць апорнымі. У значнай колькасьці апорных ячэек партыйная работа яшчэ не перабудавана. Партыйныя сілы правільна не расстаўлены. Рост партыі, асабліва ў саўгасах і апорных ячэйках — вельмі слабы. Палітвучоба не наладжана. Так, напрыклад, у Быхаўскім раёне з 14 партыйцаў, якія ўваходзяць у апорную саўгасную ячэйку «Чырвоны маяк», непасрэдна на вытворчасьці працуе толькі тры кандыдаты партыі, партыйная работа не перабудавана. У саўгасе — абязьлічка, вялікая цякучасьць рабочай сілы, слабое гаспадарчае кіраўніцтва. У выніку — вялікі адыход парасят, за паўгода здохла 196 штук. Або вось у саўгасе «Халоўе» (Дубровенскі раён) у вядучым сьвінагадоўчым цэху няма ні аднаго камуніста, у той час, як у жывёлагадоўчым цэху працуе 9 камуністаў. У ячэйцы саўгасу імя Блюхера — 26 членаў і кандыдатаў партыі, між тым, як непасрэдна на вытворчасьці з гэтых 26 чалавек знаходзіцца толькі 2 члены партыі і адзін кандыдат, а астатнія партыйцы займаюць месцы кладаўшчыкоў і сярэдняга адміністрацыйнага персаналу.

Я мог-бы падобныя факты няўмелага, няправільнага разьмеркаваньня і расстаноўкі партыйных сіл памножыць у некалькі разоў.

Трэба адзначыць, як сур'ёзны недахоп у рабоце саўгаснай апорнай ячэйкі, амаль поўную адсутнасьць кіраўніцтва партгрупамі і парторгамі. Роля парторга часта зводзіцца да функцый партыйнага інфарматара. Мелі месца выпадкі, калі вылучаныя парторгі на працягу паўгода, а то і больш ня ведаюць, што яны зьяўляюцца парторгамі. Калі інструктар ЦК, абсьледуючы апорную ячэйку саўгасу «Міхневічы» (Рагачоўшчына), запытаўся ў парторга аб яго рабоце, дык апошні заявіў, што да гэтага часу ня ведаў, што ён зьяўляецца парторгам. Паасобныя галаваногі ігнаруюць масавую партыйную работу. Загадчык вучастку ў жывёлагадоўчым саўгасе імя Блюхера адмовіўся рабіць даклад аб пастанове ЦК па жывёлагадоўлі, матывуючы тым, што «нам патрэбна работа, а не даклады». Дырэктар саўгасу «Зара Захаду» прыехаўшай з ЦК брыгадзе заявіў: «Нам патрэбна бульба, а ваша перабудова партыйна - масавай работы нам непатрэбна і не дапаможа».

Вось, таварышы, характарыстыка палітычнага ўзроўню раду нашых нізавых гаспадарчых кіраўнікоў. Павінен адзначыць, што гэты дырэктар саўгасу заявіў: «Я газэт ня чытаю, ва ўніверсытэце ня вучыўся, а справу сваю ведаю добра, разумею, дзе правы і дзе «левы» ўхіл».

Але, ня гледзячы на «добрае веданьне справы», райкому партыі ўсё-ж такі прыйшлося зьняць гэтага дырэктара з работы, як адпетага правага ўхіліста (**сьмех**).

З адзначаных недахопаў, якія ёсьць у рабоце апорных ячэек, выцякаюць і тыя практычныя задачы, якія павінны стаць перад райкомамі партыі, апорнымі ячэйкамі ў далейшай іх рабоце па ператварэньні апорных ячэек у сапраўды **вядучыя ячэйкі.**

Раённыя парторганізацыі павінны неадкладна разгарнуць бальшавіцкую работу па рэалізацыі апошніх дырэктыў ЦК аб стварэньні апорных пунктаў партработы на вёсцы.

Апорнай ячэйкай, як правіла, павінна быць ячэйка і больш шматлікая, і больш моцная, і з большым моцным партыйным і беспартыйным актывам, чым суседнія, бліжэй размешчаныя ячэйкі. Уся работа апорнай ячэйкі саўгасу, МТС, а таксама буйнага калгасу, як ячэйкі вядучай, перадавой, павінна быць сапраўды ўзорнай як у галіне партыйна - масавай работы, так і ў галіне арганізацыі працы.

Цэнтральная задача апорнай ячэйкі — аказваць, пад кіраўніцтвам райкому партыі, штодзённую практычную дапамогу вакольным калгасным ячэйкам на аснове перадачы ім вопыту сваёй работы. Толькі ажыцьцяўляючы гэту задачу, задачу перадачы суседнім ячэйкам свайго станоўчага вопыту, задачу аказаньня штодзённай практычнай дапамогі, ячэйкі саўгасаў, МТС і буйнейшых калгасаў змогуць ператварыцца ў сапраўдную апору для РК партыі ў яго канкрэтным апэрацыйным кіраўніцтве калгаснымі ячэйкамі, у барацьбе за ўраджай, за якасьць, за арганізацыйна - гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, за сацыялістычнае перавыхаваньне калгаснікаў.

Рост колькаснасьці ячэек, узросшая роля ячэек саўгасаў і МТС у правядзеньні веснавой сяўбы, праполкі і ў падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі сьведчаць аб наяўнасьці раду значных дасягненьняў у справе ўмацаваньня вясковай часткі партарганізацыі.

Разам з гэтым неабходна адзначыць, што якасьць партыйна - масавай, палітыка-выхаваўчай работы гэтых ячэек усё яшчэ значна адстае ад узросшых задач, ад узросшых запатрабаваньняў да саўгасу, МТС — як да асноўных вагароў сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі.

Пастанова ЦК УсесКП(б) аб перабудове партыйнай работы ў саўгасах знайшла сваё праламленьне толькі ў нязначнай частцы ячэек. Зроблен толькі пачатак у справе перабудовы партыйнай работы. Гэта перабудова пакуль што выяўляецца ў арганізацыі партыйных груп і вылучэньні парторгаў. Ёсьць зрух у справе ўмацаваньня авангарднай ролі камуністаў у брыгадзе. У часе правядзеньня веснавой сяўбы ў радзе ячэек саўгасаў і МТС камуністы паказалі прыклад высокай рэвалюцыйнай сьвядомасьці, далі з беспартыйнымі значна лепшыя колькасныя і якасныя паказальнікі, у параўнаньні з выкананьнем вытворчых заданьняў.

Аднак, роля камуніста на вытворчасьці часта зводзіцца толькі да прыкладнасьці ў рабоце без адначасовага актыўнейшага ўцягваньня ў сацспаборніцтва і ўдарніцтва ўсёй астатняй асноўнай масы рабочых. У палітычным жыцьці раду саўгасаў і МТС роля камуніста, як палітычнага вожака рабочых, адчуваецца яшчэ вельмі слаба.

Неадкладнае зьнішчэньне адзначаных вышэй недахопаў у рабоце ячэек саўгасаў і МТС, карэнная перабудова форм і мэтадаў зьместу вытворчай партыйна-масавай работы ў саўгасах і МТС у адпаведнасьці з апошняй пастановай ЦК партыі, павышэньне бальшавіцкай баязьлівасьці, клясавай пільнасьці камуністаў саўгасаў і МТС — такавы неадкладныя задачы ячэек саўгасаў і МТС.

Ва ўсёй гэтай рабоце неабходна памятаць выключна важную ролю саўгасаў і МТС, як вядучага пачатку сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, неабходна памятаць буйнейшую ролю саўгасаў і МТС у рэалізацыі тых вялізарнейшых гістарычных задач, што пастаўлены перад намі ў другой пяцігодцы пастановамі XVII усесаюзнай партыйнай канфэрэнцыі.

«Саўгасы,—гаворыцца ў пастанове XVII партканфэрэнцыі, — павінны папярыць сваю вытворчасьць па ўсіх галінах, у тым ліку ў галіне тэхнічных культур і жывёлагадоўлі, і **ўзмацніць сваю ролю ўзораў сацыялістычнай арганізацыі вытворчасьці** і прыстосоўваць да сельскай гаспадаркі высокую машынную тэхніку і ўсе дасягненьні сучаснай агранаміі і зоатэхнікі».

«У галіне жывёлагадоўлі ў другой пяцігодцы,—гаворыцца ў тэй-жа пастанове, — неабходна дабіцца такога павялічэньня стада і росту таварнай прадукцыі, якое-б адпавядала вырашэньню ў асноўным жывёлагадоўчай праблемы для СССР, як гэтага паўстала дамаглася ў першай пяцігодцы ў адносінах да збожжавай праблемы».

Падкрэсьліваньне ў пастановах XVII усесаюзнай партканфэрэнцыі асаблівых задач саўгасаў у галіне разьвіцьця тэхнічных культур і жывёлагадоўлі мае выключнае значэньне для саўгасаў БССР. Адсюль — задачы далейшага росту і якаснага ўмацаваньня саўгасаў, павялічэньня ўраджайнасьці, пасьпяховага аўладаньня высокай машыннай тэхнікай, правільнага прыстасаваньня агратэхнікі, зоатэхнікі, рацыянальнай арганізацыі вытворчасьці на базе трактараў, складаных с.-г. машын, правільнай арганізацыі працы, барацьбы за павышэньне прадукцыйнасьці працы, за скарачэньне страт у саўгаснай вытворчасьці, за правільнае і рацыянальнае выкарыстоўваньне трактарнага парку і парку с.-г. машын.

Выпэйўказаныя задачы павінны быць цэнтральнымі, вузлавымі ў партыйна-масавай рабоце саўгасных ячэек, яны-ж павінны вызначаць зьмест як партыйнай, так і масавай работы ячэек саўгасаў і МТС.

Ячэйкі саўгасаў і МТС павінны разгарнуць вялізарную работу па мабілізацыі мас на пасьпяховае, баявое правядзеньне ўборачнай кампаніі, на рэалізацыю тых задач, што пастаўлены пастановай ЦК партыі і ўраду перад уборачнай і збожжазагатоўчай кампаніямі і на гэтай аснове дабіцца павышэньня клясавай пільнасьці, арганізаванасьці, згуртаванасьці вакол ячэек шырокага беспартыйнага актыву.

Работа і становішча калгасных ячэек

Выключна важнае значэньне калгасных ячэйкі мяюць у арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў — цэнтральнай задачы калгаснага будаўніцтва на даным этапе, у правядзеньні важнейшых гаспадарча-палітычных мерапрыемстваў партыі, у справе сацыялістычнага перавыхаваньня калгаснікаў.

За апошні год ёсьць рад бязумоўных посьпехаў у справе ўмацаваньня работы калгасных ячэек — рост іх сеткі, павялічэньне колькасьці і т. п.

Разам з тым пленум ЦК павінен згрунаваць увагу на тых буйных прарывах і недахопах, якія характэрны для значнай колькасьці калгасных ячэек. Трэба падкрэсьліць адзначыць, што многія РК вельмі фармальна, пядбайна падышлі да самай работы па стварэньні і ўмацаваньні калгасных ячэек, прымацаваўшы да калгасаў сельскія ячэйкі ў незалежнасьці ад таго, ці ёсьць у гэтай ячэйцы камуністы-калгаснікі, ці няма. Так, напрыклад, у ячэйцы калгасу «Ўдарнік» (Старобінскі раён) з 20 камуністаў у калгасе працуе толькі ўсяго адзін кандыдат, а рэшта — прымацаваныя. Лагойскі раён, паведамляючы аб лагойскай ячэйцы, чамусьці называе гэтую ячэйку калгаснай у той час, як у яе ўваходзіць 29 служачых, але няма ні аднаго калгасніка.

Буйнейшы недахоп у рабоце значнай колькасьці калгасных ячэек — слабае, зусім нездавальняючае становішча масавай, арганізацыйна - палітычнай і выхаваўчай работы.

Напрыклад, Нісьцяноўская калгасная ячэйка (Рагачоўскі раён) замест партмасавай работы ўжывала голае адміністраваньне, выносіла пастановы аб тым, каго пэрсанальна вычышчаць з калгасу, а старшыня другога калгасу (імя Варашылава) выклікаў калгаснікаў і заяўляў ім: «Паводле прапановы ячэйкі вы выключаны з калгасу», ня ставіўшы пытаньня аб выключэньні на абгаварэньне агульнага сходу калгаснікаў.

Важнейшым пытаньнем у рабоце калгасных ячэек зьяўляецца арганізацыя расстаноўкі партыйных сіл, павышэньне авангарднай ролі камуністаў.

У большасьці ячэек на гэта пытаньне яшчэ ня зьвернута ўвага, расстаноўкай сіл камуністаў не займаюцца.

Перабудова работы калгасных ячэек у сэнсе перанясеньня цэнтру цяжару партыйна-масавай работы ў нізавое зьвяно моцна ўпіраецца яшчэ ў невыстарчальную колькасьць камуністаў у ячэйцы, у нізкі якасны склад сакратароў ячэек, у надзвычай нізкі ўзровень палітычнага разьвіцьця камуністаў, у адсутнасьць кіраўніцтва і дапамогі з боку РК па перабудове работы.

У асобных ячэйках ёсьць спробы стварыць партгрупы ў асобных галінах гаспадаркі (фэрмы, паляводчыя брыгады) і больш шырока практыкуецца вылучэньне партарганізатараў. **Партгрупы і парторгі працуюць кожны па сваёй уласнай ініцыятыве і амаль ніякага кіраўніцтва імі няма ні з боку РК, ні з боку сакратароў ячэек.**

Прыкладам правільнай расстаноўкі партсіл у калгасе зьяўляецца ячэйка камуны «Чырвоны артылерыст», Полацкага раёну. Ячэйка складаецца з 6 членаў і 2 кандыдатаў. Сілы расстаўлены наступным парадкам: у паляводчай брыгадзе № 1 — 2 кандыдаты і адзін камсамолец, у паляводчай брыгадзе № 2 — 2 кандыдаты, у садова-гародняй брыгадзе — 1 член партыі і 3 камсамольцы, на СТКФ — 1 кандыдат партыі і 3 камсамольцы. У брыгадах вылучаны парторгі. Такім чынам усе брыгады гатага калгасу забясьпечаны партыйна-камсамольскімі сіламі. У калгасе «Шлях да сацыялізму», Старобінскага раёну, камуністы заняты так: 1 — старшыня калгасу, 1 — загадчык сьвінафэрмы, 1 — прафілактык на сьвінафэрме, 1 — брыгадзір на МТКФ і 2 радавыя калгаснікі на полі. У гэтых калгасах зусім правільна больш за ўсё забясьпечан камуністамі жывёлагадоўчы цэх, як вядучы.

Найбольш пашыраным тыпам калгаснай ячэйкі зьяўляюцца ячэйкі калгасаў:

„Кастрычнік", Хойніцкага раёну,	5 членаў	і 4 канд.,	з іх працуе ў калгасе	8 чал.
„Камунар" „ „	5 „	3 „	„ „ „	7 „
„Шлях да сацыялізму", Старобінскага р-ну,	2 чл.	і 4 канд.,	з іх працуе ў калгасе	6 „
„Дружба", Рагачоўскага раёну,	3 члены	і 8 канд.,	з іх працуе ў калгасе	6 чал.
„Свабода" „ „	7 „	4 „	„ „ „	6 „
„Чырвоны маяк", Клімавіцкі „	3 „	4 „	„ „ „	5 „
„Бальшавік Беларусі" „ „	10 „	16 „	„ „ „	16 „

Пры гэтым калгасная ячэйка «Дружба» абслугоўвае пяць калгасаў, ячэйка «Свабода» абслугоўвае два калгасы, «Чырвоны маяк» — 2 калгасы. Пры такім складзе гэтыя ячэйкі абслугоўваюць і сельсавет і німат увагі зварочваюць на правядзеньне рэальнага роду гаспадарча - палітычных кампаній. Такім чынам гэтыя ячэйкі зьяўляюцца калгаснымі толькі па назве, застаючыся на справе фактычна—ячэйкамі не калгаснымі, а па зьместу сваёй работы — сельсавецкімі.

У сапраўдных калгасных ячэйках ёсьць некаторы паварот да вытворчасьці, аднак, асноўныя пытаньні арганізацыі мас яшчэ ня сталі ў цэнтры ўвагі ячэек. Нават ў лепшых ячэйках невыстарчальна разгорнута работа на прыкладную вытворчую брыгаду за ажыцьцяўленьне ў калгасах сапраўднага, разгорнутага сацспаборніцтва і ўдарніцтва, слаба адчуваецца ўвага спэцыялізаваным галінам калгаснай гаспадаркі.

Больш-менш здавальняюча расстаўлены партсілы і арганізаваны зьвеньні ў **Званецкай калгаснай ячэйцы,** у склад якой уваходзяць 3 члены і 8 кандыдатаў партыі. Ячэйка арганізавала адну партгрупу з 5 камуністаў у калгасе «Дружба», высунула парторгаў пры калгасе «Дняпровец» (2 камуністы), пры калгасе «Камунар» (2 камуністы), калгас «Полымя» (2 камуністы), да калгасу «Прапа» парторг прымацован. Ячэйка гэтага камуністы працуюць у сельсавеце і ў спажывецкім таварыстве. Непасрэдна ў калгасе працуюць 6 камуністаў, з якіх адзін брыгадзір садова-гародняй брыгады, адзін старэйшы конюх, два ў паляводчых брыгадах, старшыня калгасу і загадчык гаспадаркі. Ячэйка сапраўды ўзялася за перанясеньне цэнтру цяжару ў нізавое зьвяно. Парторгі і партгрупы атрымліваюць канкрэтныя заданьні ў іх рабоце ў калгасах і брыгадах.

Кожны парторг атрымаўшы канкрэтнае заданьне ў часе веснавой сяўбы, праводзіў яго ў сваім калгасе і брыгадзе, у прыватнасьці, па распрацоўцы апошніх дырэктыў ЦК, СНК, **у выніку чаго, па-першае, у сельсавеце не разваліўся ні адзін калгас, па-другое, у той час, калі на 25 мая сярэдпа-краёне выкананьне пляну сяўбы было 34 проц., у Званецкім сельсавеце было 57 проц.**

Што-ж гэта ячэйка прарабіла для ўмацаваньня калгасаў, для сваячасовага правядзеньня сяўбы? Па-першае, кожны камуніст, працуючы ў калгасе, зьяўляецца прыкладам у рабоце, сыстэматычна перавышае нормы выпрацоўкі. Па ініцыятыве парторга ў калгасе «Камунар» забясьпечан патрэбны догляд коней, у калгасе «Прыдняпровец» па прыкладу і ініцыятыве парторга калгаснікі сабралі для пасеньня калгасу 100 пуд. бульбы.

У часе перапынку на полі праводзіліся гутаркі па растлумачэньні пастаноў ЦК і СНК, а таксама лятучыя вытворчыя нарады. У калгасах і сельсаветах выпускаецца 5 пасьценгазэт: у трох калгасах — штодзённыя брыгадныя газэты і ў астатніх двух калгасах — трохдзённыя і апрача таго выпускаецца пасьценгазэта пры сельсавеце. Насьценныя газэты адыгрываюць выключна вялікую ролю ў барацьбе з гультаямі, зрыўшчыкамі веснавой сяўбы. Бывалі выпадкі, калі паасобныя калгаснікі пасьля зьмяшчэньня ў насьценнай газэце допісаў аб іх нядбайнасьці ў рабоце, рабіліся лепшымі ўдарнікамі.

Апрача таго Званецкая калгасная ячэйка на сходах калгаснікаў і працоўных адзіноасобнікаў прапрацавала ўсе дырэктывы партыі і ўраду аб веснавой сяўбе, збожжазагатоўках, мясазагатоўках, калгасным гандлі, аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў. Ячэйка мае пастаянны ўлік калгаснага актыву і праводзіць з ім работу: нарады і зьлёты па асобных пытаньнях, даюцца даручэньні па масавай рабоце. Сходы парт ячэйкі праводзяцца ў розных калгасах і пават у брыгадах, у залежнасьці ад характару пытаньняў, якія абгаварваюцца. Камуністы і камсамольцы ў Званецкай партыйнай ячэйцы сапраўды займаюць вядучае месца на вытворчасьці, у разгортваньні сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва. Усе — ударнікі.

Пераходзячы да пытаньня партыйна-масавай работы ў ячэйках, неабходна адзначыць, што першай і асноўнай задачай ячэек саўгасаў і МТС зьяўляецца **ўсямернае ўмацаваньне партыйнымі сіламі нізавога вытворчага зьвяна,** правільная расстаноўка партыйных сіл, забясьпячэньне пастаяннага складу нізавых партыйных зьвеньняў, забясьпячэньне штодзённым, канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтвам нізавымі зьвеньнямі з боку ячэйкі, разгортваньне творчай актыўнасьці і ініцыятывы нізавых зьвеньняў партарганізацыі, ажыцьцяўленьне на практыцы гістарычных указаньняў т. Сталіна.

Высокая якасьць партыйнай работы калгасных ячэек, паварот іх шчыльна тварам да вытворчасьці, канкрэтнасьць і апэрацыйнасьць кіраўніцтва азначаюць перш за ўсё правільную і ўмелую работу ячэйкі па мабілізацыі і арганізацыі калгасных мас на выкананьне бягучых вытворчых задач. Высокая якасьць партаучобы азначае разгортваньне, на аснове авангарднай ролі камуністаў у калгаснай вытворчасьці, на аснове бальшавіцкай самакрытыкі і шырокай масавай работы — творчай актыўнасьці мас — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Неабходна дабіцца, каб кожнае нізавое зьвяно жыло поўным партыйным жыцьцём, каб у канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтве калгаснымі масамі па выкананьні імі вытворчых задач, палітычна рос і загартоўваўся партыйны актыў, каб вакол кожнай ячэйкі згуртоўваўся беспартыйны актыў з лепшых калгаснікаў - ударнікаў, каб на аснове гэтага бесьперапынна расла партарганізацыя і ўмацоўваўся аўтарытэт камуністаў у калгасах, як палітычных кіраўнікоў і барацьбітоў за генэральную лінію партыі.

Толькі пры такой пастаноўцы партыйнай работы калгасныя ячэйкі здолеюць з гонарам выканаць ускладзеныя на іх партыяй вялізарныя задачы па ўзьнаўленьні на вышэйшую ступень калгасаў па барацьбе за ўраджай, за самую высокую якасьць сельскагаспадарчай вытворчасьці, за далейшыя посьпехі ў справе арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў.

Брыгада павінна стаць **цэнтральным зьвенам** ня толькі вытворчасьці ў калгасе, але і ва ўсім партыйна-палітычным жыцьці калгасу. Трэба дамагацца, каб ніводная брыгада ня была пакінута без адпаведнага партыйнага кіраўніцтва. Не павінна быць у калгасе ні аднаго камуніста, які ў тэй ці іншай форме ня прымае ўдзелу ў партработе ў брыгадах. Пры гэтым трэба асабліва рашуча весьці барацьбу з **фармальным, папяровым падыходам да разгортваньня гэтага важнейшага пытаньня.** Ня досыць толькі стварыць і аформіць нізавое партзьвяно (партгрупа, партарганізатар). Неабходна штодзённым, канкрэтным і апэрацыйным кіраўніцтвам калгаснай ячэйкі забясьпечыць сапраўдную **бальшавіцкую баязьлівасьць** кожнага нізавога зьвяна.

Толькі апіраючыся на актыў з перадавікоў, герояў калгаснай вытворчасьці, калгасныя ячэйкі і раённыя партыйныя арганізацыі здолеюць сапраўды канкрэтна і апэрацыйна кіраваць калгасам і з посьпехам вырашаць задачы павышэньня ўраджайнасьці і павышэньня якасьці калгаснай вытворчасьці. Камуністы на поле, на фэрмы, у брыгады! — вось лёзунг калгасных ячэек, лёзунг, які трэба пастойліва ажыцьцяўляць.

(Працяг будзе ў наступным нумары).

Працэс белабандыта Гаргулава

Судзяць Гаргулава—выгараджваюць яго саўдзельнікаў

ПАРЫЖ, 26. На пытаньне аб паказаньнях Песьмяянава ў Празе, які абвінавачваў Гаргулава ў тым, што ён быў савецкім агентам, Гаргулаў усхвалявана заяўляе, што гэты манархіст прадаў яго камуністам.

Далей допыт пераходзіць да прабываньня Гаргулава на Францыі, арганізацыі ў Парыжы **«зялёнай» партыі** разам з Кручко вым і Аджапавым на **аснове праграмы зўрапэйскай вайны для «вызваленьня Расіі».**

Гаргулаў адказвае, што Кручкоў і Аджапаў яго прадалі. Партыя, арганізаваная ім, была нацыянал - дэмакратычнай, рускай рэспубліканскай партыяй. Старшыня ўказвае, што Гаргулаў парваў з гэтым трыумвіратам і зышоўся з Якаўлевым і Крынкіным, г. зн. з групай «вялікай Русі», якая выдае газэту «Набат».

Гаргулаў адказвае, што Якаўлеў—манархіст, прадаў яго, бо «ня прымаў яго рэспубліканска - дэмакратычных ідэалаў».

Старшыня пераходзіць да пытаньня аб прыезьдзе Гаргулава ў Парыж 5-га мая, што азначае, што напярэдадні забойства Гаргулаў пісаў пісьмы свайго роду мэмарандум пад загалоўкам **«Мэмуары Гаргулава, які забіў францускага прэзыдэнта».** Мэмарандум потым быў знойдзен у Гаргулава. Гаргулаў прызнае, што ён пакінуў Манака з думкаю забіць прэзыдэнта.

Палітычная праграма белабандыта

У адказ на пытаньні старшыні суда, Гаргулаў гаворыць доўгую прамову, заяўляючы, што ён, Павел Гаргулаў, галава нацыянальна - дэмакратычнай рэспубліканскай партыі, вораг манархізму і камунізму, прымаў удзел у сусьветнай вайне, меў «Георгія» і ненавідзеў манархію, якая прадала краіну. Ён спачуваў Савінкаву, сацыялістам-патрыётам, ён вораг бальшавікоў. Ён прымаў удзел у паўстаньнях казакаў, змагаўся ў радах сялянскай арганізацыі супроць камунізму, быў два разы арыштаваны і нелегальна выехаў за граніцу ў Польшчу. Ён працаваў з Савінкавым, ЧК прыгаварыла яго да сьмерці. Ён быў членам сацыял-дэмакратычнай партыі.

Далей Гаргулаў заклікае «зразумець трагедыю рускага, для якога ня існуе закону і добрага жыцьця, якому забаранілі ехаць у іншыя краіны». Ён ня можа здрадзіць сваёй ідэі. Калі ён выдаў сваю праграму, дык цяперашняя трагедыя была тым самым ужо падрыхтавана.

Ён прасіў чэхаславацкіх міністраў дапамагчы яго бацькаўшчыне, але яны адмовіліся. Чэхаславацкі ўрад пазбавіў яго дыплёму пібы за дрэнне лячэньне, у сапраўднасьці-ж за палітычную прапаганду. Потым ён паехаў ва Францыю, быў прыцелем Францыі, спадзяваўся на яе дапамогу, бо «апрача Францыі дапамагчы Расіі ня было каму: Германія, Англія, Амэрыка працуюць з саветамі». Ён—«апостал сваёй ідэі»—страляў не з-за помсты, або беднасьці, а **з-за палітычных матываў.** Трагедыя рыхтавалася гадамі. Ён змагаўся супроць камунізму і манархізму. Францускі ўрад падаслаў да яго правакатараў, агентаў манархістаў, пакшталт Кручкова, Аджапава. Ён бачыў, што францускі ўрад разьбівае яго мэтад вядзеньня суда. Працэс вядзецца максымальна шпарэм тэмпам.

На пытаньне старшыні суда — у які момант у Гаргулава склалася думка забіць Думэра і калі ён зрабіў надпіс на партрэце Калчака, знойдзеным у яго кватэры ў Манака «7 лютага 1920 г. —6 мая 1932 году», Гаргулаў адказвае што рашэньне аб забойстве насьпела ў яго ў момант прачытаньня ім абвесткі аб надыходзячым адкрыцьці Думарам выстаўкі пісьменьнікаў-камбатантаў. Надпіс-жа быў зроблен перад адездам.

Потым Гаргулаў тлумачыць свае матывы, заяўляючы, што ён хацеў пратэставаць супроць несправядлівай палітыкі Францыі, хацеў памерці, але **ранэй хацеў забіць паўкакоцнага прадстаўніка СССР ў Парыжы, але ня сустрэў яго, хоць і шукаў.** Гаргулаў заяўляе, што нічога ня меў супроць Думэра. Калі-б замест Думэра быў другі, ён забіў-бы і другога.

Што датычыць злачынства, дык ён зрабіў злачынства адзін. На запытаньне старшыні—што меў Гаргулаў супроць францускай палітыкі, ён адказвае, што францускі ўрад не хацеў дапамагаць яго «ідэі», вынішчаў яго.

Пасьля гэтага старшыня задае наступнае пытаньне:

— У чым вы абвінавачвалі Францыю, за што хацелі помсьціць ёй, чаму забілі прэзыдэнта? Гаварэце, бо я закончыў допыт.

Гаргулаў пашамінае, што ў Лізе нацый францускія дэлегаты сустракаюцца з літвінавым, які прадстаўляе камунізм.

Старшыня перакрывае Гаргулава, заяўляючы, што апошні меў досыць часу для падачы сваіх матываў. Перад судом праходзіць сьведкі замаху — былы міністар юстыцыі кабінету Тардзе — **Рэйно,** пісьменьнік **Фарэр,** супрацоўнік «Ніці журналь» —**Мортан,** які аказаў першую дапамогу, доктар **Поль,** дырэктар муніцыпальнай паліцыі **Гішар,** паказаньні якіх нічога новага ня ўносяць і прадстаўляюць сабою толькі ўжо вядомыя падрабязнасьці замаху 6-га мая на выстаўцы пісьменьнікаў ў гатэлі Ротшыльда.

Гаргулаў, якому старшыня кожны раз прапануе дадаць штосьці новае, зноў парываецца далей гаварыць аб сваёй «ідэі» як адзіным спосабе выратаваць Эўропу, аб тым, што Думэр — ахвяра палітычнай вайны. Пасьля гэтага пасяджэньне закрываецца да наступнага дня.

Асноўныя вывады, якія можна зрабіць аб гапрарму працэсу, наступныя: 1) Нехто пакуль ня робіць сур'ёзных спроб ажыцьцяўлення версіі першага перыяду сьледзтва. Абарона прабуе даказаць ненармальнасьць Гаргулава. Палітычны бок працэсу па магчымасьці змазваецца, а ўсяляк выпукляюцца чыста матар'яльныя падрабязнасьці забойства, фармальна юрыдычныя моманты і зусім не паглыбляюцца пытаньні аб палітычных сувязях Гаргулава.

Па сутнасьці ўсе пажаданьні суда накіраваны па тое, каб паказаць, што Гаргулаў дзейнічаў адзін, без супольнікаў, — усё ра- та праходзіць чырвонай ніткаю праз увесь мэтад вядзеньня суда. Працэс вядзецца максымальна шпарэм тэмпам.

ПРЫГАВАР НАД ГАРГУЛАВЫМ

ПАРЫЖ, 27. Судом прысяжных Гаргулаў засуджан да кары сьмерцю.

Наперакор ваенна-падявым судам і шыбеніцам

Фашысцкая прэса амаль кожны дзень паведамляе аб усё новых і новых выпадках выступленьняў працоўных мас акупаваных Зах. Беларусі і Зах. Украіны супроць акупантаў. Узмацняецца нацыянальна-вызваленчая барацьба на ЗБ і ЗУ, узмацняецца таксама рэвалюцыйны рух і ў карэннай Польшчы. Пад ударамі рэвалюцыйных мас трашчыць і хістаецца будынак крывавай фашысцкай дыктатуры.

Для характарыстыкі тых настроеў, якія зараз пануюць на ЗБ і ЗУ, вельмі цікавым зьяўляецца факт, паданы фашысцкай газэтай «Ілюстраваны Кур'ер Подзелны» з Вальні.

«Глухая вёска на далёкай Вальні—**Стары Аляксінец,** каля Вішнёўца 26 чэрвеня была сьведкаю надзвычайнага відовішча. У гэтай мясцовасьці сабраліся тысячы людзей па пахаваньне **Янкі Маляра,** які ўцёк з турмы і якога 11 год шукала польская паліцыя. Маляр адбываў катаргу за забойства 5 польскіх салдат у часе адступленьня польскай арміі ў 1920 г.

Праз 11 год па даносу адной вясковай жанчыны паліцыяй быў акружан дом, у якім жыў Маляр. Апошні бачачы, што робіцца, узьлез на дах, прадраў страху, саскочыў на зямлю і пачаў уцякаць. Паліцыя адкрыла на ім агонь і Маляр загінуў».

Далей карэспандэнт фашысцкай газэты падае малюнак пахаваньня забітага ўкраінскага селяніна. Ён піша:

«Цела гэтага ўкраінскага «героя» было хавана сапраўды з князеўскай роскашшу. Труна з нябошчыкам была пастаўлена на воз запрожаны 6 белымі конямі. Труна і воз былі пакрыты кветкамі і зеляніцай, акружаны сялянскаю вартай у нацыянальным украінскім убраньні. Варта складала 100 чалавек.

Пад музыку духавога аркестру пахавальная працэсія ішла з Вішнёўцу аж да могілак. На могілках пад труной адзін з удзельнікаў жалобнай працэсіі, самы стары па ўзросту, сівы дзед, апрануты ў нацыянальную вопратку, сказаў кароткую прамову такога зьместу: «Мы ведаем, кім ты быў і ведаем за што загінуў».

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

29 ліпеня г. г., роўна ў 7 гадз. вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету (пляц Волі № 4, 3-ці паверх) адбудзецца

ПАСЯДЖЭНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНСКАГА ГАРСАВЕТУ.

Яўка членаў і кандыдатаў Савету, загадчыкаў аддзелаў, трастаў і прымацаваных да працы ў Савеце дэлегатак абавязкова.

Парадак дня:
1) Народна-гаспадарчы плян гораду на III квартал (дакл. т. Каранеўскі).
2) Дабрабыт гораду (дакл. т. Млодак).
3) Арганізацыйныя пытаньні.

ГАРСАВЕТ.

29 ліпеня, роўна ў 6 гадзін вечара, у памяшканьні залі пасяджэньняў гарсавету ад будзецца

пасяджэньне фракцыі пленуму Гарадзкога Савету.

Фракцыя прэзыдыуму Гарсавету.

ЛЕТНІ ТЭАТР САДУ „ПРАФІНТЭРН"
Ад 26 ліпеня зусім абноўленая праграма 4-га цыклю эстрадна-цырковых, паказаў
МЮЗІК-ХОЛ
у 2-х аддзяленьнях.

„Інтэрнацыянал" Гарольд Лёйд у амэрык.-камэдыі Баязьлівасьць да жанчын
Зьвыш праграм. хроніка Саюзкіно

ГУКАВЫ кіно-тэатр „Чырвоная Зорка".
У пралёту і вялёту нар. артыст рэсп. В. Г. Качалаў.
ПЕРШЫ гукавы мастацкі фільм ПУДЗЕЛА
Ад 29-га ліпеня аднаўляецца пастаноўкай
Рэж. Н. Экк. Камп. Я. Столяр.
Вытворчасьць гук. фабрыкі „Рот-фронт" Мэжрабпом-фільм.
Жыцьцё драма ў 7 частках і 31 эпізодзе.
У ГАЛ. РОЛЯХ: арт. МХТ М. Баталаў, М. Жараў, Н. Гонта, І. Кірла, М. Джагафараў і інш.
Трыё гарманістаў Макараў, Кузьняцоў Панкоў.
Штодзённа 4 сэансы. Каса ад 4 гадз.
Пачатак у 6-30, 7-15, 9 і 10-45.
Адміністрацыя папярэджвае, што тых, хто спозьніцца, на сэанс не дапускаюцца і білеты губляюць моц.

„Пралетары" Дзеці ня дзіцячыя сэансы КАНЕЦ ДЗЕРАГІНА
Зьвыш праграм. хроніка Саюзкіно
„СПАРТАК" Пач. 6-30, 8, 9-30. 11 г. Каса—ад 5 г.
Замест мастацкі фільм Праект інжынэра Страта
Драма ў 6 частках.

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ" СЕНЬНЯ, 29 ліпеня і штодзённа
мастацкі фільм (новы экзэмпляр)
БУХТА СЬМЕРЦІ
драма ў 7 частках
У ГАЛ. РОЛЯХ: Б. ЗАГОРСКІ, Н. САПТЫКОЎ, Л. ЮРАНЕЎ.
ЗВЫШ ПРАГРАМЫ—хроніка САЮЗКІНО.

Прадасьця-рога абанэнтам Менскай электрастанцыі.
У апошнія дні ў горадзе патрапляюцца выпадкі, што да абанэнтаў зьяўляющіе неядомыя асобы пад відам кантраляроў электрастанцыі, пасьля ўходу якіх зьяўляецца прапажа тых ці іншых рэчаў.
Электрастанцыя паведамляе, што ні ад усіх асоб, якія зьяўляюцца да абанэнтаў ад яе імя,